ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І ЎПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

№ 6 (462) | Пятніца, 23 лютага 1940 года | Цана 20 кап.

XXII ГАДАВІНА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Дзень рашучага ўдару ўзброеных сіл маладой Рэспублікі Советаў па інтэрвенцкіх бандах пад Нарвай і Псковам, ля подступаў да Ленінграда — 23 лютага 1918 года — з'явіўся днём нараджэння Чырвонай Арміі.

Сёння Чырвонай Арміі і Чырвонаму Флоту 22 годы. Пройдзен гераічны шлях. Палымнеючай славай авеяны баявыя сцягі арміі сацыялістычнай краіны.

Арганізаваная і ўзрошчаная Леніным і Сталіным, верная сцягу бальшавіцкай партыі, Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія паказала нябачаныя ў гісторыі чалавецтва прыклады мужнасці і гераізма ў абароне заваёў Вялікага Кастрычніка, у ахове непарушнасці свяшчэннай совецкай зямлі, у выкананні сваёй гістарычнай вызваленчай місіі.

Чырвоная Армія разграміла інтэрвенцкія полчышчы ў гады грамадзянскай вайны. Арганізатарам і натхніцелем яе перамог быў вялікі Сталін. Сталін і яго баявыя саратнікі — М. В. Фрунзе, К. Е. Варашылаў, С. Орджанікідзе арганізавалі і гераічную абарону Беларускай ССР. Таварыш Сталін, Чырвоная Армія далі беларускаму народу свабоднае і шчаслівае жыццё.

Чырвоная Армія дзякуючы клопатам таварыша Сталіна, бальшавіцкай партыі, усяго совецкага народа вырасла ў грозную, непераможную сілу. Сталінскія пяцігодкі забяспечылі нябачана вялікі рост і ўдасканаленне баявой тэхнікі, агнявой магутнасці нашай арміі.

Чырвоная Армія баявымі подзвігамі — разгромам ворага ля Хасана, ля Халхын-Гола, вызваленнем Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, у баях з белафінскімі бандамі праславіла на ўвесь свет сілу совецкай зброі.

Мужныя сыны радзімы, доблесныя воіны вялікага совецкага народа ўступаюць у 23-ці год існавання нашых узброеных сіл, бліскуча ператвараючы ў жыццё свяшчэнныя словы ваеннай прысягі. З іменем Сталіна, услаўляючы маці-радзіму, громяць яны ворага — фінскую белагвардзейшчыну — на зямлі і на вадзе, у паветры і пад вадой.

Сакрушальны ўдар Чырвонай Арміі па маннергеймаўскіх бандах разбівае авантурныя замыслы імперыялістаў Англіі і Францыі аб выкарыстанні Фінляндыі ў якасці плацдарма для ваеннай інтэрвенцыі супроць СССР.

Чырвоная Армія—неадрыўная частка совецкага народа, яго любімае дзецішча — пільна ахоўвае мірную працу краіны сацыялізма. І ўвесь 183-мільённы совецкі народ, згуртаваны вакол партыі Леніна — Сталіна, ні на мінуту не забывае аб капіталістычным акружэнні. Совецкі народ нясхільна ўмацоўвае сваю мабілізацыйную гатоўнасць, ваенную падрыхтоўку, сувязь з Чырвонай Арміяй.

22-ю гадавіну РСЧА і ВМФ совецкія пісьменнікі і работнікі мастацтваў сустракаюць узбагачаныя новым вопытам абароннай, армейскай работы.

Песня, музыка, мастацкае слова ўваходзяць у магутны і грозны арсенал узбраення нашай арміі.

У дні вызвалення Заходняй Беларусі пісьменнікі нашай рэспублікі паказалі добрыя прыклады выканання свяшчэннага абавязку совецкага патрыёта — сваё ўменне біць ворага і куляй і словам. Байцамі, камандзірамі падраздзяленняў, работнікамі ваеннага друку былі многія пісьменнікі.

Вострае слова лістовак, як трапная куля, разіла ворага. Хвалюючыя вершы і песні натхнялі нашых герояў-байцоў і з радасным уздымам падхопліваліся народам, якому несла свабоду Чырвоная Армія.

Выдатны вопыт работы армейскага літаратара набылі М. Лынькоў, П. Броўка, П. Глебка і многія іншыя нашы пісьменнікі.

І сёння на фронце, у праслаўленых часцях нашай арміі, якія громяць банды фінскай белагвардзейшчыны, — таленавіцейшы беларускі драматург Кандрат Крапіва, малады паэт Міхась Калачынскі. І сёння Крапіва-камандзір даводзіць, што ён умее валодаць вінтоўкай не горш, чым пяром, можа біць ворага куляй так, як б'е сілай сатыры Крапіва-драматург.

Але нашы пісьменнікі яшчэ ў даўгу перад Чырвонай Арміяй. Патрэбна хутчэй аплаціць гэты доўг — даць творы, прагна чакаемыя мільёнамі чытачоў, аб чырвоных воінах, якім вялікі беларускі народ абавязан сваім з'еднаннем, аб легендарных подзвігах нашых герояў-байцоў, аб магутнасці непераможнай арміі совецкага народа.

Нясхільна ўмацоўваць сваю дружбу з Чырвонай Арміяй, сваю традыцыйную шэфскую работу па мастацкаму абслугоўванню чырвонаармейскіх часцей павінен калектыў работнікаў мастацтваў нашай рэспублікі.

Новымі поспехамі творчасці, уздымам работы на карысць абароны, пашырэннем сувязей і супрацоўніцтва з Чырвонай Арміяй адзначым слаўны юбілей—22-годдзе Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота!

Чырвоная Армія, як увесь совецкі народ, бязмежна аддана сваёй маці-радзіме, вялікай справе Леніна—Сталіна.

Чырвоная Армія пад кіраўніцтвам выдатнейшага палкаводца—любімага наркома, маршала Совецкага Саюза Кліма Варашылава з кожным днём множыць славу магутнай совецкай зброі, ваенную славу вялікага совецкага народа.

Чырвоная Армія непераможна, бо яе выхоўвае і вядзе да новых і новых перамог вялікі Сталін.

Няхай жыве Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія!

Няхай жыве наш бацька і настаўнік, вялікі правадыр народаў — таварыш Сталін!



І. В. Сталін у гады грамадзянскай вайны. Работа мастака П. Васільева. (Фота-кліша ТАСС).

ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ— АРМІЯ ВЫЗВАЛЕННЯ ПРАЦОЎНЫХ

Дзень Чырвонай Арміі — 23 лютага — наша ўсенароднае свята. Народы Совецкага Саюза беззаветна любяць сваю Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію.

Створаная, выраслая, загартаваная ў баях пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна, Чырвоная Армія краіны сацыялізма служыць вялікай мэце абароны нашай радзімы і вызвалення прыгнечаных народаў.

Наша Чырвоная Армія сваю XXII гадавіну азнаменавала нябачанымі ў сусветнай гісторыі гераізмам і самаахвярнасцю, подзвігамі і перамогамі, якімі ганарыцца ўвесь совецкі народ.

«Крыніцай гераізма, храбрасці, смеласці і адвагі байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі з'яўляецца іх адданасць справе нашай комуністычнай партыі, іх бязмежная любоў да сваёй радзімы, да свайго народа і вялікага Сталіна» (Варашылаў).

Пасля гераічных баёў ля возера Хасан і Халхын-Гола, пасля вялікага паходу для вызвалення Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі Чырвоная Армія наносіць сакрушальныя ўдары фінскай белагвардзейшчыне.

Упершыню ў сусветнай гісторыі войнаў і ваеннай справы пад магутнымі ўдарамі Чырвонай Арміі на Карэльскім перашэйку пада непрыступныя стальныя і жалеза-бетонныя ўмацаванні, якія гадамі ствараліся сусветным імперыялізмам.

Імперыялісты падрыхтоўвалі адсюль новую інтэрвенцыю супроць Совецкага Саюза. Цяпер Чырвоная Армія ліквідуе небяспечны ачаг вайны, створаны ў Фінляндыі падпальшчыкамі сусветнай бойні.

Вызваленне фінскага народа ад панавання банды маннергеймаў-тапнераў — гэта абарона Совецкага Саюза ад новай крывавай інтэрвенцыі.

Мудрая сталінская палітыка совецкага ўрада і магутнасць Чырвонай Арміі забяспечваюць нашу мірную працу і недатыкальнасць граніц нашай вялікай радзімы.

Абарона радзімы, служба ў Чырвонай Арміі — гэта свяшчэнны абавязак кожнага грамадзяніна СССР. І ў баях з фінскай белагвардзейшчынай нашы совецкія людзі — байцы Чырвонай Арміі — абараняюць сацыялістычную радзіму мужна, умела, з дастоінствам і гордасцю, не шкадуючы сваёй крыві і самога жыцця для дасягнення поўнай перамогі над ворагамі.

Слаўны і гераічны шлях прайшла за 22 годы пад непераможным сцягам Леніна—Сталіна наша Чырвоная Армія.

Стваральнікам, арганізатарам, выхавацелем і правадыром Чырвонай Арміі была і з'яўляецца непераможная бальшавіцкая партыя Леніна—Сталіна. Вялікія правадыры нашай партыі Ленін і Сталін стварылі і выхоўвалі нашу Чырвоную Армію, кіравалі яе палітычнай асветай, вялі яе да перамог.

Пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна ў гады грамадзянскай вайны ў Чырвонай Арміі праславіліся выдатнымі перамогамі такія вядомыя палкаводцы новага тыпу, як Фрунзе, Варашылаў, Будзённы, такія бальшавіцкія камісары, як Кіраў, Орджанікідзе, Куйбышаў, такія беззаветныя героі, як Чапаеў, Шчорс, Пархоменка, Лазо і многія іншыя. Пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна бальшавікі выхоўвалі Чырвоную Армію ў духу бязмежнай адданасці справе комунізма, народу, у духу беззаветнай адвагі і гераізма. Пад кіраўніцтвам Леніна і Сталіна Чырвоная Армія змагла разграміць мільённыя арміі белагвардзейцаў і інтэрвентаў. Чырвоная Армія, раздзетая і разутая, галодная і дрэнна ўзброеная, біла ворагаў і на берагах Ціхага акіяна, і ля Чорнага мора, і ў стэпах Украіны, і ў лясах Беларусі, і ў тундрах крайняй Поўначы, перакуліла і выкінула за совецкія межы полчышчы белагвардзейцаў і інтэрвентаў чатырнаццаці дзяржаў.

У рэзультаце неаслабных клопатаў і ўвагі таварыша Сталіна, бальшавіцкай партыі, усяго совецкага народа, у рэзультаце гіганцкіх перамог сацыялізма, індустрыялізацыі і калектывізацыі краіны, у рэзультаце перамогі сталінскіх пяцігодак Чырвоная Армія няўхільна расла і мацнела, атрымала лепшую ў свеце ваенную тэхніку, ператварылася ў магутную і непераможную, у лепшую армію ў свеце.

Наша Чырвоная Армія з'яўляецца цяпер наймагутнейшай арміяй, якая ўзброена выдатнейшай тэхнікай, авалодала ваенным майстэрствам, стратэгіяй і тактыкай, мае лепшыя ў свеце кадры, якія ведаюць, за што яны змагаюцца. Наша Чырвоная Армія цяпер можа не толькі абараніць ад любога ворага граніцы Совецкага Саюза, але і аказаць неабходную дапамогу прыгнечаным народам, якія змагаюцца за сваё вызваленне.

«Ніякі вораг ужо не зможа зламаць наш Совецкі Саюз» (Молатаў).

Абапіраючыся на маральна-палітычнае адзінства совецкага народа і на гаспадарчую магутнасць СССР, наша Чырвоная Армія можа разграміць любога ворага. Чырвоны Паветраны Флот СССР з'яўляецца мацнейшым у свеце, ён можа за адзін залп абрушыць на галовы ворагаў звыш 6 000 тон бомб, ён мае знішчальнікі і бамбардыроўшчыкі з хуткасцю, значна пераўвышаючай 500 кілометраў. Па магутнасці артылерыйскага агню ў свеце няма арміі, роўнай нашай Чырвонай Арміі. Чырвоная Армія забяспечана магутнымі танкамі, сучаснай аўтаматычнай зброяй, боепрыпасамі.

Балтыйскі Чырвонасцяжны Флот паказаў высокія ўзоры гераізма ў баях з белафінамі.

Совецкі Саюз стварае магутны, дастойны вялікай дзяржавы, марскі і акіянскі флот. Магутныя лінкоры, крэйсеры, быстраходныя мінаносцы, падводныя лодкі ахоўваюць подступы к марскім граніцам СССР.

Магутнасць ваеннай тэхнікі Чырвонай Арміі памнажаецца на выдатных людзей, якіх не мела і не можа мець ні адна армія капіталістычных краін.

Байцы, палітработнікі і камандзіры Чырвонай Арміі, натхняюцца вялікімі ідэямі Леніна—Сталіна, ведаюць, што яны змагаюцца за справу працоўных, за вялікую справу комунізма. Чырвоная Армія «з'яўляецца арміяй сусветнай рэвалюцыі, арміяй рабочых усіх краін» (Сталін).

Совецкі народ чула клапоціцца аб сваёй Чырвонай Арміі. Ні адна армія ў свеце не акружана такой гарачай любоўю ўсяго народа, як Чырвоная Армія. «Наша армія ёсць адзіная ў свеце, якая мае спачуванне і падтрыманне з боку рабочых і сялян. У гэтым яе сіла, у гэтым яе моц» (Сталін).

«За Радзіму! За Сталіна!»—вось баявы лозунг Чырвонай Арміі, з якім яна ідзе да новых перамог. І недалёка дзень, калі Чырвоная Армія пабеданосна завершыць разгром маннергеймаўскіх банд, ліквідуе небяспечны ачаг вайны і забяспечыць моцны мір і дружбу Совецкага Саюза з народам дэмакратычнай Фінляндыі.

Совецкі Саюз, які мае магутную Чырвоную Армію і Чырвоны Флот, непераможны. Пакуль будзе існаваць капіталістычнае акружэнне, мы будзем няўхільна мацаваць нашу Чырвоную Армію—магутны аплот нашай мірнай працы, радасць і гордасць совецкага народа, надзею прыгнечаных народаў усяго свету.

Слава героям Чырвонай Арміі! Слава адданым сынам нашай вялікай Радзімы! Слава адважным байцам за вялікую справу комунізма, справу Леніна—Сталіна!

Н. СТЭРНІН.

Міхась КАЛАЧЫНСКІ

З ФРАНТАВЫХ ВЕРШАЎ

1. Гармонь

З вясёлых вёсак на Палессі,
Па зімніх сцежках, бальшаках
У край Суомі мы прынеслі
Гармонь таварыша ў руках.
Каля агня ў бары смалістым,
Калі стаяла ноч вакол,
Мы акружалі гарманіста
Сямейным задушным гуртком.
Сушылі ў цёплым, горкім дыме
Свае анучкі з мокрых ног,
Снавалі думы аб радзіме,
Што засынала без трывог.
Па пушчах хмурае Суомі
У бой на ворага ішлі.
Тры разы планкі на гармоні
Прабіты кулямі былі.
Мы гарманістам даражылі,
Вясёлы быў і малады —
Смалой прабоі заляпілі,
Зрабілі новыя лады.
Пад фінскай вёскай Місі-Каўку
У зінеўшы новы год
Мы рыхтаваліся ў атаку
Праз ямы воўчыя і дрот.
У снежнай стыні акружылі
Тады таварыша свайго,
Сыграць напеўную прасілі
Перад атакаю яго.
Апошні раз блішчалі планкі
І пальцы бралі строгі лад —
З тае суровае атакі
К нам не вярнуўся музыкант.
Мы Місі-Каўку ўзялі з боем,
Праз ямы воўчыя прайшлі,
Гармонь, заляплены смалою,
З сабой у веску прынеслі.
Сям'ёй сабраўшыся, мы ўспомнім
Не раз таварыша свайго.
Гучаць над долямі Суомі
Гармонь і песенькі яго.

2. Смалакур

За азёрамі леснымі,
Побач з тоўстым сасняком
Вырас чорны ўвесь ад дыму
Смалакура хілы дом.
Міма дома мы праходзім
Па густому сасняку,
К смалакуру мы заходзім, —
Прывітанне, смалакур!
Акрапёны чорнай сажай
Нас ён выйшаў сустракаць;
Барадой яго у сажань
Можна снежкі падмятаць.
К смалакуру мы заходзім,
Рад бясконца смалакур.
Камандзір пры уваходзе
Падае яму [illegible]
Нас, прамерзлых на марозе,
У смалакурню кліча дзед.
І цякуць, на радасць, слёзы
У яго па барадзе.
Завязалася размова,
Разгараліся карчы.
Чалавек, скупы на слова,
Размаўляў бы да начы.
Толькі нас заве дарога —
Доўгі шлях прайсці палку.
Пакідаем мы старога,
Да сустрэчы, смалакур!

3. У разведцы

Ляжу на варожай скале,
Прамёрз да касцей і скалеў.
Сваіх ні душы не відно—
Чужыя спуюць пада мной.
Камені з-пад снегу тырчаць,
Не думаю я адступаць.
Лепш ляжу, як камень, нямым,
А толькі не здамся чужым.

4. Лірычнае

Другія кажуць:
—Не кахай.
А я без памяці кахаю,
Вязу любоў у дальні край,
На вечныя снягі не губляю.

Дзеючая Армія, Карэльскі перашэек.



«У дазоры». Мастацкая вышыўка жонак камандзіраў Паўночна-Каўказскай ваеннай акругі (з выстаўкі ў Маскоўскім ДЧА). (Фота-кліша ТАСС).

АГІТТЭАТР ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя была сапраўды народнай рэвалюцыяй. І калі пачалася грамадзянская вайна, у якой народ павінен быў са зброяй у руках адстойваць заваёвы сваёй рэвалюцыі, комуністычная партыя і совецкая ўлада сталі настойліва дабівацца, каб кожны працоўны разумеў прычыны і мэты грамадзянскай вайны і з поўнай свядомасцю ўсімі сродкамі дапамагаў перамозе рэвалюцыі. Вось чаму агітацыя, прапаганда, палітычная асвета ігралі велізарную ролю ў грамадзянскай вайне.

Выключнае значэнне мела палітычная работа ў Чырвонай Арміі. «Поспехі нашай арміі тлумачацца перш за ўсё яе свядомасцю і дысцыплінай, — указваў таварыш Сталін у 1918 годзе.—Наш чырвонаармеец, — заяўляў ён,—горда называе сябе салдатам рэвалюцыі, ён ведае, што ваюе не за прыбыткі капіталістаў, а за вызваленне Расіі, ён вядзе гэта і смела ідзе ў бой з адкрытымі вачыма» («Праўда», 30 кастрычніка, 1918).

Сіла бальшавіцкай агітацыі, як неаднаразова падкрэсліваў Ленін, заключалася ў тым, што яна была праўдзівай. І іменна таму «мы перамаглі ў грамадзянскай вайне не толькі сілай нашай зброі, але і нашай палітычнай прапагандай».

Мастацтва не магло заставацца ў баку ад агітацыйна-прапагандысцкай работы. Велізарнай сілай свайго ўздзеяння на свядомасць і пачуццё людзей яно павінна было дапамагаць барацьбе народных мас за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі.

Сацыялістычная рэвалюцыя шырока расчыніла дзверы тэатраў перад масавым гледачом. Совецкая ўлада акружыла тэатр найвялікшымі клопатамі, не гледзячы на выключна цяжкую абстаноўку грамадзянскай вайны і гаспадарчай разрухі. Шырокія масы працоўных не толькі напоўнілі залы тэатраў, але і самі прынялі самы актыўны ўдзел у тэатральнай рабоце.

Іменна народныя масы разам з перадавымі дзеячамі прафесіянальнага тэатра і з'явіліся творцамі агіттэатра грамадзянскай вайны, г. зн. тэатра, працуючага непасрэдна для Чырвонай Арміі. Гэты тэатр прыйшлося ствараць амаль цалкам занава.

У гады грамадзянскай вайны паявіўся рад п'ес, сюжэты якіх узяты з мінулага: гераічныя драмы аб рэвалюцыйных рухах ці бытавыя п'есы з жыцця рабочых і сялян. Для п'ес на сучасныя сюжэты характэрны два ўхілы: бытавы і сімвалічны, у некаторых п'есах наглядаецца дзіўнае спалучэнне таго і другога. Рамантычныя тэндэнцыі, уласцівыя мастацтву таго часу, атрымалі яркае выражэнне ў п'есах А. В. Луначарскага.

Першай совецкай п'есай была «Містэрыя Буфф» В. В. Маякоўскага; у гэтай п'есе закладзены асновы нашага агітацыйнага тэатра. Потым паявіўся рад п'ес, ілюстроўваўшых падзеі грамадзянскай вайны і звязаныя з ёю перажыванні. Аўтары гэтых п'ес заклікалі да абароны рэвалюцыі і яе заваёў, растлумачвалі сутнасць барацьбы, гаварылі аб сіле працоўных мас, праслаўлялі гераізм Чырвонай Арміі і раскрывалі яе асветную і арганізуючую ролю ў адносінах да сялянства, паказвалі зверыны твар ворага і напаміналі аб пільнасці да яго падкопаў. Шмат увагі аддавалася становішчу сялянства ў грамадзянскай вайне — на гэту тэму ёсць п'есы такіх пісьменнікаў, як А. Серафімовіч («Мар'яна»), А. Нявераў («Захарава смерць», «Грамадзянская вайна»).

Новая тэматыка, якая знаходзілася ў станаўленні, не заўсёды ўкладвалася ў прывычныя рамкі п'есы — адсюль узнікае разнастайнасць драматургічных форм. Патрэбнасць перадаць у тэатральных вобразах з'явы і перажыванні эпохі робіць аўтарамі новых п'ес чырвонаармейцаў, рабочых, сялян, палітычных і гаспадарчых работнікаў. Многія п'есы няспелыя, слабыя, наіўныя, але некаторыя творы, як «Чырвоная праўда» загінуўшага на фронце А. Вермішава, моцны сваім рэалізмам, пераканаўчасцю вобразаў і палажэнняў.

К канцу грамадзянскай вайны ствараюцца спецыяльныя прафесіянальныя тэатры малых форм. У рэпертуары паяўляюцца невялікія эстрадныя творы на сюжэты, звязаныя з абаронай рэвалюцыі. Гэта было, па сутнасці, перанясеннем на сцэнічныя падмосткі метадаў агітацыі, выпрацаваных органамі совецкага друку; у прыватнасці, вялікую ролю адыгралі тут «Окна сатиры РОСТА» Маякоўскага.

Тэатр спадарожнічае Чырвонай Арміі з самых першых яе дзён. Вельмі шырока размяркоўваліся паміж чырвонаармейцамі бясплатныя білеты на спектаклі і канцэрты. Ва ўсіх тэатрах наладжваліся шматлікія спектаклі выключна для чырвонаармейцаў. Часта перад такімі спектаклямі з уступнымі прамовамі выступалі лепшыя майстры культуры, як А. В. Луначарскі, А. А. Блок і інш. Асобныя канцэртныя групы і тэатральныя калектывы выязджалі з спектаклямі і канцэртнымі праграмамі ў чырвонаармейскія казармы і на фронт. Аналагічныя паездкі рабілі і рабочыя самадзейныя драматычныя гурткі. Былі створаны новыя прафесіянальныя стацыянарныя тэатры спецыяльна для абслугоўвання часцей Чырвонай Арміі і Чырвонага Флота.

Вялікую ролю адыгралі франтавыя перасоўныя трупы, арганізаваныя палітарганамі Чырвонай Арміі і нярэдка выступаўшыя на перадавых пазіцыях. Яны немала зрабілі для павышэння баявога духу чырвонаармейцаў. Разам з тым франтавыя трупы аказаліся выдатным сродкам для перавыхавання косных элементаў акторства, для набліжэння работнікаў тэатра да Чырвонай Арміі, да народа, да пралетарскай рэвалюцыі.

Творчыя імкненні чырвонаармейцаў, з аднаго боку, і недахопы прафесіянальных труп — з другога, прывялі да незвычайна шпаркага развіцця велізарнай сеці чырвонаармейскіх самадзейных тэатральных гурткоў, якія звычайна з'яўляліся неадлучнай часткай чырвонаармейскіх клубаў.

Стварыўся рад самадзейных калектываў павышанага тыпу, як чырвонаармейскія студыі, у прыватнасці, пры ваеннавучальных установах: тэатральна-драматычная майстэрня Чырвонай Арміі (Петраград, 1919—1920) і Першы самадзейны тэатр Чырвонай Арміі (Разань, а потым Масква, 1920—1921), удзел у якім прымаў В. В. Маякоўскі.

Развіццё элементаў імправізацыі ў рабоце калектываў, і вопыты самадзейнай драматычнай творчасці садзейнічалі паяўленню новых драматычных форм, як інсцэніроўка, масавае дзеянне, агітсуд, жывая газета.

Працоўныя совецкай краіны і ў першую чаргу Чырвоная Армія стварылі новы тып тэатра — тэатра рэвалюцыйнай агітацыі. Гэты тэатр зрабіўся асновай для будаўніцтва совецкага тэатра ў цэлым. Гэта быў першы і грандыёзны вопыт рэвалюцыйнага ваеннага тэатра, які з'явіўся ў многіх адносінах правобразам рэспубліканскага ваеннага тэатра ў іспанскай вайне 1936—1938 гг. і тэатра нацыянальна-вызваленчай барацьбы Кітая.

Гераічная барацьба працоўных нашай радзімы супроць белагвардзейцаў і інтэрвенцкіх армій чатырнаццаці капіталістычных дзяржаў выхавала новае пакаленне стойкіх і таленавітых дзеячоў совецкага тэатра і драматургіі; яна вызначыла мужны, волевы стыль совецкага мастацтва. Мастацтва стала зброяй у гэтай барацьбе; адсюль — палітычная накіраванасць і баявы характар перадавога совецкага тэатра і драматургіі, іх адданасць сацыялістычнай рэвалюцыі і нянавісць да ворагаў народа.

Слаўныя баявыя традыцыі совецкага мастацтва, яго непарыўная сувязь з Чырвонай Арміяй, мацнеючая з дня ў дзень, наглядна праявіліся і ў сучасны момант пры абароне совецкіх граніц на Далёкім Усходзе і ў дні вызвалення Чырвонай Арміяй Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, калі совецкія артысты выступалі сярод байцоў на перадавых пазіцыях. І, нарэшце, калі 30 лістапада 1939 года войскі Ленінградскай ваеннай акругі і Чырвонасцяжны Балтыйскі ваенна-марскі флот выступілі на дапамогу фінскаму народу, — на фронт зараз-жа адправіліся брыгады эстрадных, драматычных і оперных артыстаў і мастацкай самадзейнасці.

Совецкае мастацтва з'яўляецца абавязковым удзельнікам абароны краіны сацыялізма. Але формы яго ўдзелу ў абароне краіны мяняюцца. Чырвоная Армія і Ваенна-Марскі Флот цяпер непараўнальна мацней ва ўсіх адносінах, чым у дні грамадзянскай вайны. Каласальна вырас і совецкі тэатр і ўмацавалася яго сувязь з арміяй. Цяпер можна і неабходна ставіць пытанне аб арганізацыі ўсяго мастацтва пад знакам абароны, аб яго канкрэтных мабілізацыйных задачах.

Трэба, каб у момант, калі партыя і ўрад пазавуць совецкі народ да ўзброенай абароны сацыялістычнай радзімы, усе нашы мастацкія і ў прыватнасці тэатральныя арганізацыі маглі ператварыцца ў баявыя агітапараты. Гэта значыць, што кожны тэатр і кожны драматург, рэжысёр, актор павінен асвоіць той від мастацкай агітацыі, які яму найбольш блізкі — наш агіттэатр павінен быць разнастайным па сваіх метадах і формах. Зусім недапушчальна супроцьстаўляць «агітку» «высокаму мастацтву», — нам патрэбна высокамастацкая агітка, якая гаворыць, як і ўсякае сапраўднае мастацтва, на мове поўнацэнных мастацкіх вобразаў. Але ў агіттэатра ёсць свая спецыфіка: хуткасць адгукання на падзеі, мабільнасць, гнуткасць, аперацыйнасць, партацыўнасць. Для яго асабліва абавязковы чоткасць у змесце і форме, яркая выразнасць, канкрэтнасць і дакладная мэтанакіраванасць.

Вопыт агіттэатра грамадзянскай вайны, які з'яўляецца ў значнай меры рэзультатам рэвалюцыйнай творчасці народных мас, — таксама як і больш познія вопыты супрацоўніцтва тэатра з Чырвонай Арміяй, — можа і павінен даць каштоўнейшы матэрыял для нашай агітацыйна-абароннай тэатральнай работы. Неабходна гэты вопыт уважліва даследваць і вывучаць. Лепшыя дасягненні гэтага тэатра, пераглецжаныя з пункту гледжання новых задач і новых магчымасцей, павінны быць зноў узяты на ўзбраенне нашага мастацтва. Гэта дапаможа совецкаму мастацтву стойка і пераможна змагацца з ворагамі нашай радзімы поплеч з Чырвонай Арміяй, як у гераічныя дні грамадзянскай вайны.

А. ФЕЎРАЛЬСКІ.



К. Е. Варашылаў выступае перад выбаршчыкамі гор. Мінска. Эскіз карціны мастака А. Волкава. Фота І. Каплінскага.

Справаздачна-выбарчы сход партарганізацыі ССПБ

20 лютага адбыўся справаздачна-выбарчы сход партыйнай арганізацыі саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

Сакратар партарганізацыі тав. Модэль у справаздачным дакладзе на шматлікіх прыкладах паказаў агульны ўздым беларускай літаратуры, творчыя поспехі пісьменнікаў БССР, у прыватнасці, пісьменнікаў-комуністаў. Партарганізацыя правяла вялікую работу па стварэнню ў саюзе пісьменнікаў сапраўднай творчай абстаноўкі, паляпшэнню работы праўлення саюза. Пісьменнікі прымалі актыўны ўдзел у выбарчых кампаніях. У выніку плённай творчай работы пісьменнікаў П. Броўкі, К. Крапівы, П. Глебкі, Е. Рамановіча і інш. з калектывамі нашых тэатраў з'явіліся спектаклі, дастойныя паказу на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве.

У апошні час партарганізацыя наладзіла партыйную вучобу, вывучэнне комуністамі і актывам беспартыйных пісьменнікаў твораў Леніна і Сталіна, «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Партарганізацыя вырасла за лік таленавітых пісьменнікаў. У кандыдаты партыі прыняты паэт-ордэнаносец П. Броўка, Эдзі Агняцвет і ў апошні час А. Куляшоў.

Але ўсё-ж недастатковую ўвагу ўдзяліла партарганізацыя вырашэнню асноўных творчых праблем беларускай літаратуры, арганізацыйным пытанням работы саюза пісьменнікаў, а таксама пытанням творчага росту кожнага комуніста і кіраўніцтву комсамольскай арганізацыяй.

У абмеркаванні справаздачнага даклада прынялі ўдзел 11 членаў і кандыдатаў партыі. Выступаўшыя крытыкавалі работу партарганізацыі і ўзнялі рад вельмі важных пытанняў, якія ў далейшым павінны быць вырашаны партарганізацыяй.

Тав. Броўка ўказаў на неабходнасць большай сувязі з братнімі літаратурамі—арганізацыі ўзаемных перакладаў, больш энергічнай падрыхтоўкі пісьменнікаў да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве.

Тав. Мазо адзначыў, што даклад сакратара партарганізацыі быў недастаткова самакрытычным, і падвергнуў рэзкай крытыцы работу апарата праўлення і рэдакцыі журнала «Полымя Рэволюцыі».

Рад творчых пытанняў — аб перагля-дзе апошнях літаратурнай спадчыны, вырашэнні праблем мовы, уздыме ўзроўню крытыкі, аб разгортванні творчых дыскусій, выданні фальклору—узнялі ў сваіх змястоўных выступленнях таварышы І. Гурскі, В. Вольскі, М. Клімковіч. Яны справядліва крытыкавалі і Дзяржаўнае выдавецтва БССР за ігнарыраванне работ крытыкаў—невыданне кніг нашых крытыкаў, недаацэнку выдатных твораў дарэволюцыйнай літаратуры.

Патрэбна ажывіць работу творчых секцый саюза. Вялікая работа прадстаіць у галіне вывучэння палітычнага і творчага твару пісьменнікаў заходніх абласцей БССР і па дапамозе ім. Творчыя пытанні нашай літаратуры, творчая работа кожнага комуніста-літаратара павінна быць цэнтрам увагі партарганізацыі. Узмацніць кіраўніцтва комсамольскай арганізацыяй, забяспечыць уздым усёй грамадскай работы ў саюзе совецкіх пісьменнікаў, наладзіць чоткую работу апарата праўлення саюза, літфонда—гэтыя пытанні ўзнялі таварышы Э. Агняцвет, А. Стаховіч, С. Гусеў і інш.

Сход прызнаў работу партарганізацыі здавальняючай.

У прынятай па справаздачнаму дакладу пастанове сход акрэсліў бліжэйшыя задачы партарганізацыі.

Ухвалена, у прыватнасці, распрацаваць пытанне аб паказе беларускага народа ў творах нашых пісьменнікаў, аб перадацэны беларускай дарэволюцыйнай літаратуры, падрыхтаваць нараду па пытаннях мовы.

Вызначаны канкрэтныя мерапрыемствы па далейшаму ўздыму партвучобы—вывучэнню гісторыі ВКП(б), твораў класікаў марксізма-ленінізма, узмацненню кіраўніцтва комсамольскай арганізацыяй, паляпшэнню работы абароннай і іншых творчых секцый, апарата праўлення ССПБ.

Тайным галасаваннем сакратаром первічнай партарганізацыі саюза совецкіх пісьменнікаў выбран тав. Модэль, намеснікамі сакратара—таварышы Лебедзеў і Мазо.

А. Б.

Пятрусь БРОЎКА

НОВЫЯ ВЕРШЫ

ТАНКІСТЫ

Праравацца ў тыл.
У сем назад. —
Такі атрыманы загад.

Праплыта сонная рака...
Далей шляхі наўпрост,
Клапуцца дрэвы старчмака
На ўвесь сасновы рост.

І танк, як песня,
Сагрунём
Праходзіць гушчары...
Хутчэй! Над вежавым вакном
Кавалачак зары.

На поле выскачыла брэнь,
Гудзіць сыпучы жвір,
Станць ля спускаў: «на агонь!»
Стралок і камандзір.

Праз міг на выгане сяла
Жывая гутарка пайшла.

І паехаўшы сілы ў раз,
На эграях белых рот
Загаманіў гарматны бас
І звонкі кулямёт.

Развее эфролу брудны збор.
Танкісты ў бой пайшлі.
І самы першы, пан маёр
Схіліўся да зямлі.

За ім увесь шырокі дол
Захламіўся нашчэнт —
Дзе карабінка, дзе арол,
Дзе скрыўлены багнет.

Канфедэратныя рады
Ляглі на доўгія гады.

Але адна з тайных засад
Папоралася ў абход.
Пакунак злучаных гранат.
І змоўк адважны ход.

Стырно знясілела ў руках.
Апошні стрэл — панам!
І вось прыклады на шчытах
Узнялі злосны гам.

У вочы пырснула агнём...
Сказаць старэйшы змог:
—Ну, што-ж, таварышы,
памром?..
— Памром!.. — сказалі ўтрох.

І перад імі паплыло,
Чым кожны міг жылі —
І твар каханай,
І сяло
І вежы на Крэмлі.

І кожны стомленым чалом
У розны бок глядзеў...
Шугала полымя кругом,
І чуўся грозны спеў.

Ляцеў у далечы вякоў
Магутны гімн большэвікоў.

КРЫНІЦА

Пры лесе, пад горкай
Бруіцца крыніца.
У светлай крыніцы
Вадзіца-жывіца.

Лясамі, палямі
Праходзіць дарога.
Спыняецца многа
Ля срэбра жывога.

Па конаўках, кубках
Струменьчык плёпыны...
Лягчэюць пуціны.
Яснеюць часіны.

Там ночкаю месяц
Збірае уборы,
Пад шопаты бору
Палошчацца зоры.

Я помню, калісьці
Прыходзіў уранку.
Паіў на світанку
Трубу-берасцянку.

З ручайкі малое
Памыўшыся чыста,
З прыпевам, са свістам
Іграў галасіста.

Купаллем дзяўчаты
Прыходзілі з мятай,
Аб лёсе багата
Гадалі дзяўчаты.

Збыліся жаданні
Па іхняй прымеце:
І ў хапе, і ў клеці.
І ў кожнае дзеці.

Я раю, як толькі
Спякотаю горка,
Спусціся са ўзгорку,
Зачэрпні вядзёрка.

Пры лесе, пад горкай
Бруіцца крыніца.
У светлай крыніцы
Вадзіца-жывіца.



ПЯТРУ ГЛЕБКУ

Колькі нам шчасця таго было трэба—
Кавальчак сала,
Лустачка хлеба,
Ціхі агеньчык на летняй начоўцы,
Пожых, завойстраны добра, з ядлоўца.

Пахлі з купчастых імшар галабоні,
Блізка на выпасе фыркалі коні...
Мы па-сяброўску
Не ведалі сваркі,
З моху сівога крупілі цыгаркі.

Роўна ў нас гумы над борам віліся...
Зоры дзялілі з нябеснае высі,
Марылі.
Часта ў дзіцячых узлётах
Смела плылі на каўрах-самалётах.
Ранням навыскач імчалі шляхамі,
Коней праэваўшы сваіх гарбункамі.

Сёлета ўлетку прыехаў дадому
На месца старое паблыкаў, валома.
Той-жа мурог травяністы і росны,
Тыя-ж смалістыя, рослыя сосны,
Тая-ж і рэчка з дарогі спаткала,
Тая-ж зязюля над лесам кувала...
Родныя мясціны,
Нам дарагія!
Толькі з табою мы сёння другія.

МЯЦЕЛІЦА

То разбяжыцца,
То пухам засцелецца,
Гойкае, кружыць,
Спявае мяцеліца.

Сядзе пры садзе
За дрэвамі блізкімі,
У шыбы ударыць
Сыпучымі пырскамі.

Скача, матляючы
Белай сарочкаю...
Не! Не заснуць табе
Гэтаю ночкаю.

Лесам, гаямі,
Крутымі разлогамі.
Сэрца гукаючы
Ходзіць дарогамі.

Рэха па звонкаму бору
Галёкае...
Едзе каханы
З граніцы далёкае.

Бліжай і бліжай
Вёскі ваколіца:
Думы аб любай
Сняжынкамі роццца.

Скора ўжо, скора
Два сэрцы сустрэнуцца...
Гойкае, кружыць,
Спявае мяцеліца.

ДОЖДЖ

Ані расы каторы дзень.
Пад сонечны касцёр,
Сады спавітыя ў сухмень
Ранялі свой убор.

Ні месца засені.
Прыпал
Не захаваў і лес.
Тарфянішчаў багністы чад
Змяёй у грудзі лез.

З балотаў высыпала тля,
І мірыяды мух...
На часткі трэскала зямля,
Абходзячы свой круг.

Але ўсплылі грамады хмар
Кірункамі вятроў,
Дыхнула вільгаццю у твар
З-пад чорных караблёў.

І вось на нівы, на кусты,
На жоўталісце,
Скрозь —
Ударыў колкі і густы,
Нібы іголкі, дождж.

Прабіўшы плыні духаты,
Пайшлі расліны ў рост...
І птушак жоўтыя раты
Лавілі неба з гнёзд.

Маланкі стрэламі ўстаюць,
У бубен сыпле гром...
І я захоплены стаю,
Абдожджаны кругом.

Часамі рукі прасцягну,
Нібы хачу ў палёт.
Набраклі мускулы.
Спіну —
Пасек крамністы шрот.

Да хмар імкнуся, крычучы
Ад свежых, поўных сіл:
Сячы смялей.
У твар сячы.
Змяці дашчэнту пыл.

Памкнецца ўгору творчы сок,
З ім разам паплыву...
Цераз вясёлкі бачыць зрок
Зялёную траву.

МАЛАНКА

Ці то поле,
Ці гулянка, —
Ўсе ўздыхаюць:
— Ах, Маланка!..

Хто Маланку раз пазнае —
Супакоіцца не можа:
А прыветная такая,
А рухава, а прыгожа!..

У якой бярозы белай,
Стан ты выпрасіць сумела?
Дзе, скажы, крыніцы тыя,
У якіх ты вочы мыеш?
Дзе заранка тая пала,
У якой красу забрала?...

Мы з Маланкі воч не зводзім,
Аж утрох за ёю ходзім...
Салавей нясе рацэты,
Палявод—гарох пасцеты,
Я-ж—паэмы і санеты.

А ў Маланкі камень-сэрца.
Як спаткае — насмяецца!
Я-ж маркую дні і ночы:
Любіць,
Ды сказаць не хоча...

А яна мне — пляскача!
Шах!.. ды выйшла за ўдаўца,
За ўдаўца, за брыгадзіра...

Вось цяпер гарую шчыра —
Ні да гуляў, ні да ежы...
Колькі выбегаў я сцежак.

Ці то гром,
Ці то маланка,
Я спяшаўся...
Ах, Маланка!...

Я. ШАРАХОЎСКІ

Чырвоная Армія ў творчасці Я. Купалы і Я. Коласа

Пасля таго, як быў разбіт лёд рапптаўскай схаластыкі ў пытаннях мастацкай творчасці і калі скаваныя рапптаўскім аскетызмам пачуцці совецкага чалавека атрымалі поўны прастор для свайго выражэння ў літаратуры, у беларускую паэзію і, у прыватнасці, у паэзію нашых народных паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа хлынуў пафос соцыялістычнай лірыкі.

Грамадзянская і абарончая тэмы ў іх творчасці дасягаюць арганічнага адзінства. Тэматычна іх паэзія робіцца надзвычай шматграннай. Яны песняры калгаснай вёскі і совецкага горада, песняры совецкага чалавека і яго соцыялістычных дум і пачуццяў, песняры беларускага народа і вялікай дружбы народаў, песняры сваёй соцыялістычнай радзімы.

Значнае месца ў іх творчасці займае і тэма Чырвонай Арміі. Не кажучы аб тым, што матывы пільнасці і абароны радзімы мы можам бачыць у многіх іхніх вершах, імі напісан рад вершаў, цалкам прысвечаных тэме вайны і Чырвонай Арміі. І ў вершах аб Чырвонай Арміі мы можам прасачыць тыя-ж працэсы, што адбываліся ў паэзіі Я. Купалы і Я. Коласа, узятай у цэлым.

Што характэрна, напрыклад, для верша «Чырвонаармейцы» Я. Коласа, напісанага ў 1930 годзе? У гэтым вершы шмат чаго ад так званых «газетных» вершаў. Ён напісан на злобу дня, мае на ўвазе зусім пэўную міжнародную сітуацыю і тэрмінамі існавання гэтай сітуацыі ў значнай меры акрэсліваюцца тэрміны яго ўздзеяння на чытача.

Крыху іншы характар мае верш Я. Купалы «Пад чырвонай зоркаю» (1932 год). Гэты верш Я. Купала пісаў у перыяд калі паэт жыў ужо ў соцыялістычным доме, але яшчэ не справіўся абжыць яго надаць яму прыгожы і ўтульны выгляд, калі соцыялістычная тэма ў некаторых яго вершах яшчэ не знаходзіла адэкватнага выражэння.

Але ўжо ў 1934 годзе Я. Купала напісаў такі выдатны верш, прысвечаны Чырвонай Арміі, адзін з лепшых сваіх вершаў наогул, як «Выпраўляла маці сына». Тут з велізарнай мастацкай сілай выражана любоў народа да сваёй арміі. Выпраўляе маці сына ў Чырвоную Армію, але не гаруе і не галосіць, як гэта было ў старыя часы, калі забіралі рэкрутаў у царскую армію.

Вобраз маці, што ўстае перад намі ў гэтым вершы, — гэта адзін з найбольш мастацкіх і народных вобразаў у паэзіі Янкі Купалы. Маці ні слова не гаворыць аб любві да радзімы, але мы бачым без слоў, з яе паводзін, як любіць яна Совецкую краіну.

Тыя-ж працэсы ў сэнсе поўнацэннага асваення соцыялістычнай тэмы, толькі, магчыма, у крыху менш выразнай форме, адбываліся і ў паэзіі Якуба Коласа. Аб гэтым сведчаць як вершы, цалкам прысвечаныя ваеннай тэме, так і вершы, у якіх у той ці іншай форме закранаецца тэма Чырвонай Арміі.

У 1936 годзе Якуб Колас напісаў тры вершы: «Песня салдаткі», «Салдацкая песня» і «Новая паходная», аб'яднаныя агульным загалоўкам: «Песні аб імперыялістычнай вайне».

«Песня салдаткі» і «Салдацкая песня» выяўляюць адносіны народа да службы ў царскай арміі, да імперыялістычнай вайны. Тут поўная процілегласць настроям, выражаным у вершы Янкі Купалы «Выпраўляла маці сына». Гэтыя дзве песні ўвабралі ў сябе ўсё лепшае, што ёсць у дарэволюцыйным фальклоры—у песнях салдатак і ў салдацкіх песнях, усё лепшае ў сэнсе матываў: вайна—гора народнае і ў сэнсе непасрэднасці і сілы выражанага лірычнага пачуцця.

Слабей напісана «Новая паходная», дзе салдаты заклікаюцца выступіць супроць прыгнятальнікаў-паноў. Яна гучыць рытарычна, тут шмат сцёртых, прывычных словаспалучэнняў няма канкрэтна-вобразнай паэтычнай мовы.



У барацьбе за вызваленне Заходняй Беларусі з-пад панскай няволі. Карціна мастака-самавучкі малодшага камандзіра Лятароўскага (БАВА). Фота І. Каплінскага.

Пісаў на тэму аб імперыялістычнай вайне і Янка Купала. Так, у вершы «Старыя акопы» мы бачым разлум'е паэта над акопамі сусветнай вайны.

Партызанскі рух таксама знайшоў адлюстраванне ў яго творчасці. Так, у вершы «Партызаны» ён паказвае барацьбу партызанаў за Совецкую ўладу.

Абодвума народнымі паэтамі напісан на тэму аб Чырвонай Арміі рад вершаў газетнага плана, як: «То не шум баравы», «Тры арліны», «Японскім самураям» — Янкі Купалы, «Каманіну, Молакаву і Слепнёву» — Якуба Коласа.

У многіх вершах народных паэтаў тэмы Чырвонай Арміі закранаюцца нібы ўскосна, але тым не менш у іх надзвычай выразна выяўлена любоў совецкага народа да сваёй арміі. У гэтым сэнсе асабліва характэрны такія найлепшыя ўзоры сюжэтнай лірыкі ў творчасці народных паэтаў: «Сыны», «Алеся», «Хлопчык і лётчык» — Янкі Купалы, «Шчаслівая хвіліна» — Якуба Коласа.

«Сыны» — гэта эпічны верш вялікай мастацкай сілы. Гэта балада аб будучых совецкіх багатырах, аб нашай цудоўнай моладзі, якая знаходзіць прымяненне сваім сілам у самых разнастайных галінах жыцця. У гэтым вершы паэт, скарыстоўваючы вядомы ў народнай творчасці матыў аб тым, як бацька пытаецца ў сыноў, кім яны хочуць быць, малюе імкненні, ідэалы совецкай моладзі. У бацькі шэсць сыноў і тры з іх мараць аб тым, каб стаць на пачэсную вахту абароны бацькаўшчыны Адзін, захоплены славаю «Чалюскіна», хоча быць маракам, другі хоча быць лётчыкам героем, трэці хоча быць пагранічнікам.

У дарэволюцыйным беларускім фальклоры ёсць вялікі раздзел песень аб жаночай долі. Гэтыя песні прасякнуты глыбокім сумам, у іх спяваецца аб гаротным жыцці жанчыны-сялянкі. У вершы «Алеся» Янка Купала, скарыстоўваючы некаторыя стылёвыя элементы народных песень аб долі жанчыны, паказвае шчаслівую долю калгасніцы.

У нашай краіне для жанчыны шырока расчынены дзверы ў жыццё. І глыбока памылілася маці, калі ў песні над калыскай хацела згадаць пра долю дачушкі ў спрадвеку традыцыйным плане, што будзе яна прасці кужаль, ткаць кросны і ў гэтым будзе ўсё яе шчасце. Яе дачушка зрабілася лётчыцай, перад ёю ляжыць шырокім прасторам цікавае і змястоўнае жыццё, і ўжо не зляпіць яна к прасніцы з-пад сонца. Верш гэты просты, але гэта тая прастата, якая ідзе ад сапраўднай мастацкасці. Верш вызначаецца надзвычайнай выразлівасцю малюнка і кампазіцыйнай закончанасцю.

Совецкая авіяцыя зрабіла столькі герайчных спраў, што не толькі для совецкай моладзі, але нават і для совецкіх дзяцей уяўленне аб ёй спалучаецца з рамантызмам геройкі. Яркім выражэннем гэтага светлага дзіцячага рамантызма з'яўляецца верш Янкі Купалы «Хлопчык і лётчык». У гэтым вершы паэт з выключным лірызмам малюе вобраз хлопчыка, якому хочацца паляцець з лётчыкам і паглядзець, як блукае ў лесе мядзведзь, як плывуць у далёкія моры рэчкі, якому хочацца зірнуць на мора і караблі, пабываць у Крэмлі і перадаць прывет таварышу Сталіну.

Калі ў «Алесі» Янкі Купалы маці марыла аб долі дачушкі паводле сваіх старых уяўленняў аб долі жанчыны, то ў вершы «Шчаслівая хвіліна» Якуба Коласа маці, несучы з ясляў сына, радуецца, што яе сына чакае добрае, цікавае жыццё, што дарогі яму ўсюды адкрыты: ён будзе інжынерам альбо лётчыкам.

Яна малюе яму цэлую карціну, як ён будзе лётчыкам і як, праляцаючы над роднай вёскай, скіне маці з самалёта ліст.

Верш гэты прасякнут самым сапраўдным лірызмам і з'яўляецца адным з лепшых вершаў Якуба Коласа за апошнія годы. Якое можа быць большае выражэнне народнай любві да Чырвонай Арміі, калі маці над калыскамі сваіх сыноў марыць аб тым, каб яны зрабіліся лётчыкамі!

Такая вялікая падзея ў жыцці беларускага народа і ўсяго Совецкага Саюза, як вызваленне геройчнай Чырвонай Арміяй з-пад уціску польскіх паноў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, знайшла багатае адлюстраванне ў творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа. Янка Купала адгукнуўся на гэту радасную падзею вялікім цыклам вершаў «На заходне-беларускія матывы», у якім ён горача вітае доўгачаканае з'яднанне беларускага народа і ўваходжанне заходніх беларусаў і украінцаў у вялікую сям'ю народаў СССР.

Якуб Колас таксама адгукнуўся на гэту падзею цэлым радам натхнёных вершаў.

Для гэтых вершаў нашых народных паэтаў характэрна тое, што яны напісаны на высокім мастацкім узроўні: характэрна, што незалежна ад таго, ці гэта верш эпічнага, ці лірычнага плана, у ім вобразная паэтычная мова, у ім усхваляваная думка і глыбокае пачуццё.

Вось верш Я. Купалы «Засвяціла ясна зорка», — верш эпічнага плана. Усё ў ім — ад народнага эпаса: і абагульняючая думка, і прастата паэтычнай мовы. Думы і спадзяванні народныя выражаны ў ім народнай паэтычнай мовай. Лексіка, сінтакс, інтанацыя, рытмічныя хады — усё ў ім ідзе ад традыцый народнай творчасці, прычым традыцыйныя формы ў ім не архаізуюць тэкст, не скоўваюць жывога зместу, а даюць яму свабоднае і натуральнае выражэнне. Вось таварыш Сталін

Варашылаву і кажа, —
Што з Луганска родам:
— Час нам браце, вызваляць
З-пад ярма народы!
Пасылай байцоў адважных,
Стрэльбы, кулямёты,
Танкі, трактары, гарматы,
Птахі-самалёты.

У гэтым звароце ёсць нешта ад быліннага звароту багатыра перад тым, як ён ідзе ў бой, але гэта падана не цытатна, а ў паэтычна-трансфарміраванай форме, адпаведна новаму зместу.

У вершы Янкі Купалы «З новай думкай» раптам уваскрасаюць у новым кантэксце інтанацыі верша «Сыходзіш вёска з яснай явы». Мімаволі напрашваецца думка, што паэт гэтай сугучнасцю вершаў хацеў даць аналогію, што цяпер заходнія беларусы праходзяць важны гістарычны рубеж, як для ўсходніх беларусаў быў важным гістарычным рубяжом пераход да калектывізацыі. У вершы «З новай думкай» паэт дае цэлую праграму, цэлы разгорнуты вобраз новага жыцця Заходняй Беларусі, жыцця вольнага і шчаслівага.

Цалкам прысвечан тэме Чырвонай Арміі верш Я. Купалы «Расшумеўся лес зялёны». Закранаецца гэта тэма і ў іншых вершах цыкла «На заходне-беларускія матывы».

Сярод вершаў Якуба Коласа, прысвечаных вызваленню Чырвонай Арміяй Заходняй Беларусі, асабліва вылучаюцца вершы «Свайму народу» і «Радасная сустрэча». У першым з іх паэт дае малюнак будучага шчаслівага жыцця Заходняй Беларусі ў сям'і народаў СССР. У вершы «Радасная сустрэча» паэт паказвае праз лірычны вобраз сялянскага хлопчыка гаротнае жыццё працоўнага беларуса-селяніна пад панскай апекай, потым вайну, наступ Чырвонай Арміі, уцяканне паноў, радасную сустрэчу працоўных з Чырвонай Арміяй, зварот бацькі хлопчыка з германскага фронта. Верш надзвычай мастацкі і асабліва вызначаецца народнасцю паэтычнай мовы.

Барацьба Чырвонай Арміі за вызваленне фінскага народа таксама знайшла адлюстраванне ў творчасці народных паэтаў.

З усяго сказанага мы бачым, што нашы народныя паэты прысвяцілі геройчнай Чырвонай Арміі, яе вызваленчай барацьбе, барацьбе за шчасце народаў не мала натхнёных песень, песень, у якіх з велізарнай мастацкай сілай паказана любоў народа да сваёй арміі.

ТАЛЕНАВІТЫ ДРАМАТУРГ

Сувязь Эдуарда Самуйлёнка з тэатрам пачалася ў Полацку з зімы 1933 года, калі ён згадзіўся напісаць для Гомельскага беларускага тэатра п'есу «Сержант Дроб» паводле сваёй аповесці «Тэорыя Каленбрун». Над гэтай першай п'есай Самуйлёнак працаваў паўтара года. Першай цяжкасцю, з якой сустрэўся аўтар, аказалася абмежаванасць часу. «Аказваецца, не так проста напісаць п'есу,—гаварыў ён.—У рамане ці аповесці я сам сабе гаспадар. Дзе хачу, там і скончу раздзел і вазьмуся за другі. І дваццаць ці трыццаць лішніх старонак рамана не адаб'юцца на яго якасці. А ў п'есе не тое, учапіўся за нітачку—цягні да канца, не маеш права абарваць, ды яшчэ думай, каб не было многа, бо рэжысёр стаіць у цябе над душой з вялікімі нажніцамі, ужо гатовы крамсаць яе».

Аўтару доўга не ўдавалася ўлажыць множаства падзей, якія былі ў аповесці «Тэорыя Каленбрун», у рамкі трохгадзіннага спектакля. Устала пытанне аб адборы. І толькі самакрытычны перагляд усяго матэрыялу і ўпартая праца дазволілі аўтару адхіліць усё лішняе, пабочнае і пабудаваць стройную сюжэтную лінію п'есы, якая, паступова разгортваючыся, захапляла гледача на працягу трох з паловай гадзін.

Не гледзячы на рад недахопаў, асноўны з якіх—некаторая схематычнасць рад яскрава раскрытых вобразаў п'есы (Крамарчык, Дроб, Каленбрун, Дабравольскі, Кольбэ, Ян і інш.) прымушаюць адаціць аўтара, як таленавітага драматурга. П'еса «Сержант Дроб», пастаўленая ў канцы 1935 года, мела вялікі поспех у працоўных горада і вёскі. Тысячы калгаснікаў спецыяльнымі паяздамі прыязджалі ў Гомель глядзець гэты спектакль. Гэта была першая п'еса на беларускай сцэне аб выкрыцці подлай дзейнасці польскай контрразведкі, накіраванай на падрыў магутнасці нашай сацыялістычнай радзімы.

Але многа пакут прыйшлося перанесці аўтару п'есы перш, чым «Сержант Дроб» трапіў на сцэну. Супроць п'есы ўзняліся ворагі народа, якіх яна выкрывала. Яны імкнуліся сарваць яе пастаноўку ў тэатры. І толькі ўмяшанне партыйнай і савецкай грамадскасці выратавала п'есу.

Набыўшы некаторы вопыт работы для тэатра, зразумеўшы спецыфічнасць гэтай работы, акрылёны поспехам сваёй першай п'есы, Самуйлёнак задумаў новы драматычны твор—вострую сатырычную камедыю, выкрываючую дзейнасць беларускіх нацдэмаў, пад назвай «Курачая рэспубліка». У былой панскай Польшчы, пад яе пратэктаратам, створана рэспубліка з «курачай тэрыторыяй». Урад рэспублікі мае права самастойна вырашаць толькі такія «сусветныя праблемы», як, напрыклад, завязванне хвастоў коням сталічнай конкі. Востра былі задуманы вобразы п'есы, напрыклад, міністр фінансаў Торбачка і інш.

П'есу Самуйлёнак думаў закончыць у канцы 1936 года. Але абсмяяны ворагам народа, які прабраўся на кіруючы пост і які адхіліў творчую заяўку Самуйлёнка, Эдуард пакінуў працу над гэтай п'есай.

Апошнім драматычным творам Самуйлёнка была п'еса «Пагібель воўка», якую ён задумаў напісаць адразу пасля сканчэння выдатнага рамана «Будучыня». Помню зімовы вечар; весела патрэсквае агонь у грубцы, лямпу доўга не запальвалі,—Эдуард любіў павячораваць перад агнём грубкі. Крыху змораны, але радасны ад скончанай працы, ён расказвае аб сваёй вёсцы Бандэлі, аб пагранічніках, аб калгасніках. Я дзялюся з Самуйлёнкам сваімі назіраннямі за зменамі ў псіхалогіі людзей, якія адбыліся ў выніку перамогі сацыялістычнага ладу на вёсцы і якія мне давялося наглядаць у часе гастроляў тэатра па тэрыторыі БССР і асабліва ў пагранічных раёнах. Расказваў аб сваіх сустрэчах з людзьмі, перадаваў падслуханыя гутаркі, капіраваў цікавых людзей.

Самуйлёнак дастаў рукапіс свайго няскончанага рамана «Пагібель воўка» і пазнаёміў мяне з вобразамі Мірона, Харкевіча, Насці, Міколы, Сільвачкі, Рысачка. Такім чынам пачала падбірацца галерэя вобразаў. Тут-жа прыдумваліся ўзаемаадносіны паміж вобразамі. У першы-ж вечар яскрава акрэсліліся эпізадычныя вобразы Данілы, Спепаніды і каларытная фігура рыбака Анісіма. Тут-жа накідвалася магчымая сюжэтная лінія, якая потым, у працэсе работы, змянялася некалькі разоў. Так, у той зімовы вечар, зарадзілася п'еса «Пагібель воўка». Строгасць да сябе, як да пісьменніка, прымушала Эдуарда Самуйлёнка ўпарта працаваць над п'есай, не пакідаючы ў ёй таго, што яго не задавальняла. У адным з пісьмаў ён пісаў мне:

«Пачынаў я п'есу пяць разоў і ўсе пяць разоў, падняўшы кап'ё, г. зн. пяро, адступаў у поўным парадку на зыходныя пазіцыі. Проста дзіўлюся, дальбог; напісаў не без цяжкасцей, вядома, вялікую кнігу, не раз адчуваў сябе майстрам на асобных старонках, а вось давялося за п'есу ўзяцца, віхляюся безпапаможны, як хлапчук, і ўсё «нароўлю» якому-небудзь класіку ў кішэнь залезці. Табе пішу, другому-б не прызнаўся, проста сорамна».

Асабліва цяжка прыйшлося аўтару з вобразам Мірона, які спачатку, з-за вялікай колькасці матэрыялу, не ўмяшчаўся ў п'есу, а праз яго аўтар хацеў паказаць пераемнасць класавай барацьбы з пакалення ў пакаленне, гістарычную ролю бальшавікоў.

Высокая патрабавальнасць да сябе прымушала Самуйлёнка ўпарта працаваць над кожнай сцэнай да таго часу, пакуль яна поўнасцю не задавальняла яго. Так, напрыклад, некалькі разоў перапісвалася апавяданне Насці аб парадзе на Краснай плошчы ў Маскве. Калі я параіў Эдуарду пакінуць на час гэту сцэну і пайсці далей, каб потым вярнуцца да яе, ён адказаў, што яна будзе ўсёроўна непакоіць яго і ён не зможа думаць далей над развіццём вобраза Насці. Цэлыя сцэны, маналогі выкідваліся ім, калі яны вялі ў бок ад асноўнай лініі п'есы. Наогул, калі прагледзець рукапіс п'есы «Пагібель воўка», то ўбачым тую велізарную работу, якую прарабіў аўтар, старанна адшліфоўваючы кожную сцэну, кожную асобную рэпліку.

Вельмі цікавымі з'яўляюцца рэмаркі Самуйлёнка да п'есы. Яны сведчаць аб тым, што аўтар авалодаў майстэрствам драматурга; рэмаркі заўсёды дзейсныя, поўнасцю раскрываючыя вобразы п'есы,—я назваў-бы іх рэжысёрскімі рэмаркамі. Калі вельмі цяжка давалася першая палова п'есы,—Самуйлёнак пісаў яе з мая па лістапад, то другая палова была напісана за два тыдні. «Праца хутка пакацілася пад гару»,—казаў Самуйлёнак.

Нажаль, некалькі недапрацаванай аказалася фінальная сцэна,—з прычыны хваробы аўтара, бо ў хуткім часе пасля сканчэння работы Самуйлёнак занядужаў. Але ён сам бачыў гэту недапрацаванасць і марыў, як толькі паправіцца, дапрацаваць яе. Смерць абарвала жыццё таленавітага пісьменніка, савецкага патрыёта, чэснага і скромнага чалавека.

К. Н. САННІКАЎ.

Рэжысёр Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра.



«Бронепоезд 14-69» у Мінскім дзяржаўным драматычным тэатры. Вяршынін—нар. арт. БССР В. Уладамірскі, Окарак—засл. арт. БССР Б. Платонаў.

Фота І. Каплінскага.

„Бронепоезд 14-69“

Пастаноўка Мінскага дзярждрамтэатра

На рэйзе ў блакітнай дымцы гойдаюцца браняносцы японскай эскадры. Ціха хлешча к вузкаму прычалу акіян. Прыбітая к парту баржа. Пяшчотныя гукі флейты нясуць у глядзельны зал раманс Чайкоўскага.

Так мастак В. Н. Шкляеў у супрацоўніцтве з пастаноўшчыкамі «Бронепоезда 14-69» засл. арт. рэсп. Л. Г. Рахленка і К. Н. Саннікавым задумалі пачатак спектакля.

Добры пачатак. Эпічна спакойна. У цішыні гэтай адчуваецца бура. І на самой справе: паяўляецца матрос Знобаў, ён заклікае да паўстання. Так,—парастае рэвалюцыйны шквал.

Глядач з затоенай увагай сочыць за разгортваемымі падзеямі. Больш таго,—ён чакае моцных драматычных калізій, якімі поўна п'еса Вс. Іванова. Але дарэмна, горкае расчараванне ўсё больш і больш авалодвае гледачом. І так да апошняй сцэны. Нават узяцце партызанамі бронепоезда, гэты апафеоз мужнасці і геройства, не ўзняў спектакля ў вачах гледача.

Рыхтуючыся да велізарнай у жыцці беларускага мастацтва падзеі—да дэкады, тэатр новыя свае пастаноўкі павінен быў рабіць на ўзроўні не ніжэй дэкадных. А тут мы маем яўнае зніжэнне. Ці то гэта след паспешлівасці, ці то вынік незахайнасці, але спектакль выйшаў рыхлым, неперакана́льным.

Всевалад Іваноў, буйнейшы майстар слова, заслугоўвае больш чулага да сябе падыходу, больш дасканалай работы над яго творам. І нам здаецца, што асноўны недахоп спектакля ідзе ад няправільнай трактоўкі акторамі створаных ім вобразаў.

Вяршынін — партызанскі правадыр у В. І. Уладамірскага не набыў пафатычнай шырыні, лірызма і эпічна-манументальнага характару. Няма ў ігры Уладамірскага той лірычнай непасрэднасці, якой багат Вяршынін. Нават драматызм у паказе барацьбы набываецца больш жэстамі, чым унутраным раскрыццём вобраза.

Лесінг у «Гамбургскай драматургіі» пісаў: «Пачуццё ёсць нешта ўнутранае, аб якім можна меркаваць толькі па вонкавых праявах». К. С. Станіслаўскі заўсёды патрабаваў ад актора творчага гераізма і бесперапыннага гарэння, ён патрабаваў умення падаўляць сваю ганарлівасць у інтарэсах ідэі і творчага подзвіга.

В. А. Краўцоў пайшоў па лініі пераймання, акторскага штампу. Сляпа пераймаючы вонкавыя прыёмы ігры нябожчыка Шчукіна («Ленін у Кастрычніку»), Краўцоў не данёс да гледача арыгінальны вобраз падпольнага старшыні рэўкома—далёкаўсходніка Пеклеванава.

Таленавіты і дасціпны актор Б. З. Янпольскі ўнёс у вобраз кітайца Сін-Бін шмат цеплыні. Аднак, у цэлым яго роля няўдалая. Ён вельмі шмат смяецца. Нават у самым патэтычным моманце, калі трагедыя даходзіць да кульмінацыі, нават кідаючыся пад поезд у імя шчасця рускага народа, ён выклікае ўсмешку. Гэта дзіўна. Кідаючыся пад бронепоезд, каб спыніць яго, Сін-Бін павінен быў пераварыць сваю гібель ў песню ўрачыстай перамогі. А вось гэтага і не атрымалася.

Удала сыграў ролю Ваські Окарака засл. арт. рэсп. Б. В. Платонаў. Ён жыве сапраўдным жыццём, ён па-сапраўднаму верыць у тое, што адбываецца на сцэне, ніколі не прыкідваючыся верачым. Ён жыццёвы да апошняга подыху. Ён першы кінуўся на рэльсы, каб спыніць бронепоезд.

«Ужо дыхалі, гукаючы, дрэвы, і, як пена, над імі адарваўся і прыгаў па вяршынях жоўта-багровы дым. Васька павярнуўся ўніз жыватом. Смалістыя пахлі шпалы... Гулі ў лесе рэльсы... Васька падняў галаву і ціха кінуў у кусты:

— Самагонкі няма?.. Гарыць!..

... Узняўся на локцях. Твар спятнуўся ў адну жоўтую маршчыну, вочы, як дзве пунцовыя слязы...

—Не магу-у! Душа-а!»

Гэта ў Вс. Іванова. І так—у Платонава. Ён ляжыць на гудучых рэльсах, вось-вось раздавіць яго стальная браня поезда. На душы ў яго гарыць, паліць. Ён п'е самагонку, але агонь яшчэ больш распальвае яго.

—Не магу-у! Братані-і! —выў Васька, адпаўзаючы ўніз. Так выпісана роля ў Вс. Іванова, так данёс яе да гледача Платонаў.

Словамі капітана Незеласава характарызуецца прапаршчык Обаб—«з выслужыўшыхся добраахвотнікаў калчакоўскай арміі»:

—Заклятаны вы наглуха,—нішто да вас не дойдзе!...

Такога глухога, жорсткага, нязграбнага салдафона сыграў Э. П. Шапко. І тым больш да яго нянавісць у гледача, чым больш востра раскрывае ён унутраны твар паказваемага ім прапаршчыка.

Ісціннасць усякай творчасці пазнаецца не толькі яе адносінамі да жыцця, але і яе адпаведнасцю сутнасці і прыёмам таго мастацтва, у якім яна праяўляецца. Паўрад ці можна прызнаць правільнай у гэтым сэнсе трактоўку засл. арт. рэсп. М. А. Зоравым ролі капітана Незеласава. Какаініст і кат, ён паказан вельмі летуценным і пяшчотным.

Хочацца яшчэ ўказаць на такі недахоп. Партызаны ўсе падобны адзін на аднаго: ва ўсіх аднолькавыя бароды — шырокія, лапацістыя, не знойдзена характэрнасць для кожнага партызана.

У цэлым тэатр, пастаноўшчыкі спектакля «Бронепоезд 14-69» не далі глыбокага і рэалістычнага паказу жыцця далёкаўсходніх партызанаў, майстэрска намаляванага Вс. Івановым.

Міх. ГЕННАДЗІЕЎ.

Да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА НА ДЭКАДЗЕ

Мастакі нашай рэспублікі разам з усімі работнікамі мастацтваў дзейсна рыхтуюцца да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. У дэкадзе яны прымуць удзел выстаўкай «Выяўленчае мастацтва БССР». Выстаўка з'явіцца творчай справаздачай мастакоў БССР, дэманструючай іх творчых дасягненняў. Выстаўка дасць магчымасць у братнім творчым еднанні з мастакамі сталіцы падагуліць дасягненні, абмеркаваць становішча і шляхі развіцця выяўленчага мастацтва БССР.

Выстаўка «Выяўленчае мастацтва БССР» будзе мець аддзелы: дарэвалюцыйнае мастацтва ў Беларусі, сучаснае выяўленчае мастацтва БССР, народная творчасць, архітэктура, помнікі старажытнасці і мастацтваў БССР.

У аддзеле «Дарэвалюцыйнае мастацтва Беларусі» павінна быць шырока прадстаўлена багатая і разнастайная творчасць беларускага народа. Вядома, што многія крытыкі і мастацтвазнаўцы абмяжоўвалі гісторыю развіцця выяўленчага мастацтва Беларусі ў яго дарэвалюцыйны перыяд творчасцю мастакоў Пэна і Кругера. Гэта вельмі вузкі пункт гледжання. На выстаўцы могуць быць паказаны роспісы XVII стагоддзя, слуцкія паясы, урэцкае шкло, творы дарэвалюцыйных мастакоў, у тым ліку Ю. М. Пэна, Я. М. Кругера, Л. А. Альперовіча. Арганізатарам гэтага аддзела, работнікам Карціннай галерэі БССР, прадстаіць вялікая даследчая работа, якая з'явіцца выдатнай падрыхтоўкай да напісання гісторыі выяўленчага мастацтва БССР.

Асновай аддзела «Сучаснае выяўленчае мастацтва БССР» будуць закончаныя работы для падрыхтоўваемай выстаўкі «Ленін і Сталін—арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Большасць мастакоў горача і з вялікім творчым уздымам працуе над тым, каб прыняць удзел у дэкаднай выстаўцы новымі творамі. Паміж мастакамі разгортваецца творчае спаборніцтва. Энергічна працуюць перадавыя мастакі нашай рэспублікі—заслужаныя дзеячы мастацтваў Губа і Азгур, скульптары Бразер, Глебаў, Орлоў, жывапісцы Зайцаў, Пашкевіч, Манасзон, Бразоўскі, Гаўрыленка, Е. Цхановіч, Давідовіч і многія іншыя. Але трэба ўказаць на тое, што саюз савецкіх мастакоў БССР і яго партарганізацыя дагэтуль па-сапраўднаму не ўзначалілі творчага ўздыму мастакоў.

Лепшыя майстры народнай творчасці—ткачыхі т. т. Л'пай, Мешачок Серада, Івашка, вышывальшчыцы Самусенка, Арбузова, Петракова, Каган, майстры работ па дрэву Орлоў, Вольскі, Шубадзёр, Пільман, Вольтар, разчык Івінскі, інкрустатары Гебелеў, Рубенчык, скульптары—самавучкі Міхалевіч, Мазо, Трафімаў, таленавітыя мастакі—самавучкі Церахаў, Гарбачэнка, Стронгін, Лядароўскі і дзесяткі іншых прымуць удзел у аддзеле народнай творчасці. Дом народнай творчасці БССР рыхтуе да выстаўкі вялікія тэматычныя работы, у прыватнасці, рыхтуюцца два тканых габелены на тэмы: «Сталін—друг беларускага народа» і «Лявоніха».

Арганізатарам гэтага аддзела—Цэнтральнаму дому народнай творчасці БССР, абласным аддзелам мастацтваў, абласным дамам народнай творчасці прадстаіць вялікая работа па збіранню лепшых узораў народнай творчасці: ткацтва, вышыўкі, разьбы па дрэву, інкрустацыі, керамікі і г. д., па арганізацыі і правядзенню семінара для мастакоў-самавучак, працуючых над новымі работамі. Гэта не тэхнічная, а вялікая арганізацыйна-творчая работа, ад поспеху якой залежыць багацце аддзела народнай творчасці.

Да ўдзелу ў выстаўцы прыцягваюцца і мастацка-прамысловы саюз. Аднак, кіраўніцтва саюза дагэтуль не пачало падрыхтоўкі да ўдзелу ва выстаўцы.

Беларусь багата выдатнымі помнікамі архітэктуры і мастацтва. Лепшыя з іх—полацкая Сафія, руіны замка каралевы Боны, руіны замка ў мястэчку Мір, гомельскі замак князёў Паскевічаў і многія іншыя будуць прадстаўлены ў фотавігрынах і альбомах аддзела помнікаў старажытнасці і мастацтваў БССР. У гэтым-жа аддзеле будуць прадстаўлены лепшыя работы савецкіх архітэктараў БССР Лангбарта (ДЧА, Акадэмія навук і іншыя), Войнава (Палац піянераў, новая гасцініца і іншыя) і іншых.

Да ўдзелу ў выстаўцы прыцягваюцца лепшыя мастакі заходніх абласцей БССР, у прыватнасці, Н. Рапапорт, Ю. Крыеўскі, І. Кішчаноўскі, Х. Тыбор, Е. Маляровіч і іншыя. На абласных выстаўках-агдядах творчасці мастакоў заходніх абласцей будзе зроблен адбор работ для выстаўкі на дэкадзе.

Такім чынам, прадстаіць велізарная работа. У два з паловай месяцы мастакі, архітэктары, майстры народнай творчасці павінны падрыхтаваць вялікую выстаўку, якая-б расказала на дэкадзе беларускага мастацтва аб тым, як дзякуючы нястомным клопатам партыі і ўрада, братняй дапамозе вялікага рускага народа расквітнела выяўленчае мастацтва БССР.

Д. ГЕНІН.

ЗАКЛЮЧНЫ КАНЦЭРТ ДЭКАДЫ

Фіналам дэкады з'явіцца заключны канцэрт. У праграме канцэрта—творы, якія даюць яснае ўяўленне аб музыкальным мастацтве, тэатральным майстэрстве і культурных дасягненнях Савецкай Беларусі.

Агульная кампазіцыя заключнага канцэрта аб'ядана двума вялікай палітычнай значымасці выступленнямі: песняй «Прывітанне Маскве» і фіналам—кантатай, у якіх прымаюць удзел усе калектывы. Выступленні, якія знаходзяцца паміж гэтымі асноўнымі момантамі канцэрта, размеркаваны з такім разлікам, каб стварыць адчуванне нарастання.

Выступленні салістаў упрыгожваюць праграму і служаць у агульнай карціне неабходнымі мастацкімі праслойкамі паміж вялікімі ансамблевымі нумарамі.

У першым аддзяленні пасля песні «Прывітанне Маскве» следуюць выступленні салістаў: Александроўскай, Млодак, Арсенка, Аляксеевай, Друкер, Руч'евай, Лапіна, Мурамцава ў суправаджэнні сімфанічнага аркестра, а затым сольныя выступленні балерын Тэатра оперы і балета З. Васільевай і А. Нікалаевай, салістаў Дрэчына, Мулера і інш.

У гэтым-жа аддзяленні выступяць ансамблі Хойніцкага раёна (пляскі «Юрачка» і «Мяцеліца» пад акампанімент баянаў і аркестра народных інструментаў) і хор Рэчыцкага раёна пад кіраваннем Т. К. Лапацінай.

Група адораных дзяцей Белдзяржфілармоніі і музшколы, уключаючы вялікі хор, 12 скрыпачоў, 4 віяланчэлістаў і 2 піяністаў, выканае дывертысмент—музыку беларускага кампазітара Аладава і іншыя музычныя творы.

Выступленне ансамбля песні і пляскі Дзяржфілармоніі будуецца, як паказ старажытнага вясельнага абраду, уключае ў сябе, акрамя сцэнічнай дзеі і дыялога, песні: «Было ў бацькі тры дачкі»—музыка Нікалаевіча, «Яўрэйскую калыханку»—музыка Любана і «Калгасныя частушкі»—музыка Палонскага, а таксама народную беларускую пляску «Трасуха».

Над пастаноўкай вясельнага абраду працуе вялікі знаўца беларускага старажытнага абраду народны артыст БССР Е. А. Міровіч сумесна з кіраўніком ансамбля песні і пляскі кампазітарам І. Любанам.

У другім аддзяленні хор Дзяржфілармоніі выканае некалькі песень, у тым ліку: «Ой у лузе, лузе» Любана, «Яўрэйскі танец» Палонскага, «Палярную вахту» Падкавырава, «Ой ты, рэчанька» Шчэглова, «Лявоніху» Ефімава і інш.

У праграму ўключан таксама танец рэбят, вучаніц балетнай школы Тэатра оперы і балета, у складзе 40 чалавек. Гэта танец «Цыпляты»—музыка Мусаргскага.

Аркестр народных інструментаў выконвае творы беларускіх кампазітараў Самохіна і Чуркіна.

У канцэрце прымуць удзел калектыў гомельскага клуба ім. Леніна, ансамбль песні і пляскі пагранічнікаў у складзе 150 чалавек і адзін з лепшых калектываў самадзейнасці заходніх абласцей БССР.

Фіналам заключнага канцэрта дэкады з'явіцца напісаная кампазітарам Шчэгловым кантата, прысвечаная правадыру народаў таварышу Сталіну. Кантата мае тры часткі: уступную, затым асноўную, якая ўключае ў сябе выступленне сімфанічнага аркестра (дырыжор Мусін, ён-жа дырыжор усяго канцэрта), сола—тэнар, мецца, бас і сапрана, выступленне квартэта, чытальніка, дзіцячага хора.

Апошняя частка кантаты—«Песня аб Сталіне».

Вялікая ўвага, аказваемая партыяй і ўрадам падрыхтоўцы да дэкады, стварае добрыя ўмовы для плённай творчай работы.

Касьян ГАЛЕЙКОЎСКІ.

Мастацкі кіраўнік і пастаноўшчык заключнага канцэрта.

З УЗДЫМАМ РЫХТУЕМСЯ ДА ДЭКАДЫ

Сімфанічны аркестр Дзяржаўнай філармоніі БССР з уздымам рыхтуецца да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Перад сімфанічным аркестрам стаіць пачэсная і адказная задача — пачаць і завяршыць заключны канцэрт дэкады.

Нажаль, аркестр не можа разгарнуць работу над усімі творамі, якія ўвойдуць у яго праграму на заключным канцэрце, бо рад кампазітараў не закончылі работы над гэтымі творамі.

Сімфанічны аркестр Філармоніі ў перыяд дэкады пазнаёміць шырокую грамадскасць сталіцы з дасягненнямі беларускай сімфанічнай творчасці. У радзе канцэртаў будуць дэманстрыравацца лепшыя сімфанічныя творы, напісаныя беларускімі кампазітарамі.

Падрыхтоўка да дэкады выклікала вялікі творчы ўздым у аркестры. Шырока разгарнулася соцспаборніцтва на лепшую падрыхтоўку і высокую якасць выканання як паміж паасобнымі групамі аркестра, так і паміж паасобнымі артыстамі.

Апрача таго, аркестр спаборнічае з хорам Філармоніі і аркестрам оперы.

І. А. МУСІН.

Галоўны дырыжор Філармоніі БССР.

Х. ШЫНКЛЕР

З ПЕСНЯЮ Ў ЖЫЦЦЁ

На спеўкі хора часта заходзіў кіраўнік драматычнага гуртка. Ён быў ужо немалады, гэты былы артыст правінцыяльнай сцэны. І, бадай, таму ён вельмі любіў моладзь. Непрыкметны ў поўзмроку залы, стары актор прыслухоўваўся да харавых спеваў, да дуэтаў, трыо. Ён уважліва глядзеў на танклявага і стройнага белабрысага юнака-тэнара, — ён ведаў яго, як удзельніка гурткоў, якімі кіраваў, — драматычнага, «Сіняй блузы».

Калі канчалася спеўка, артыст падыходзіў да юнака і, зняважліва пагледзеўшы ў бок хормайстра (быў гэты маэстра ўсяго-на-ўсяго багажны касір, не абцяжараны артыстычнай славай і мудрасцю сцэнічнага вопыту), павольна гаварыў:

— Слухайце, Коля... Не ведаю, ці добры з вас выйдзе начальнік станцыі, але вы зделелі-б надрэнна, нават выдатна, праспяваць арыю Германа з «Пікавай дамы». Верце слову старога артыста! Толькі... толькі хіба тут здольны раскрыць ваш голас, даць яму належную аправу?.. Тут-жа ўсе прафаны...


У словах, у інтанацыі старога актора чулася нешта знаёмае. У гэтую хвіліну ён напэўна адчуваў сябе ў адной са сваіх каронных роляў. Можа, Нешчасліўцава? Але прычым тут Нешчасліўцаў, калі словы старога актора так хвалявалі, гаварылі пра штосьці прыгожае і вабнае—як шчасце...

Пачырванелы і збянтэжаны Коля знікаў са сцэны і борстка сігаў на таварную станцыю. Там ён нагружаўся грымучым кандуктарскім прычандаллем і разам з усёй брыгадай ішоў прымаць поезд. Малады кандуктар старанна ўмацоўваў на задніх тармазе хваставыя сігналы. Здалёк ад галавы састава, даходзіў зычны гудок паравоза, дружна брызгалі буферы вагонаў і поезд рушыў з месца, набіраў хуткасць.

З зялёным, распасцёртым на ветры флажком стаяў на пляцоўцы тормаза дазорны кандуктар Коля Лазараў. Вось прамільгнулі запаленыя праменнямі заходзячага сонца шыбы станцыйных будынкаў. Узнятай угору тонкай рукой адвітаўся з поездам выходны семафор. Дазорны кандуктар дакладна выконваў службовую інструкцыю, пільна ўглядаўся ўперад, усцяж састава—ён імчаў ладнай, спраўнай чарадой вагонаў. Тады Коля скручваў флажок і павяртаўся назад. Абапал чыгункі шпарка развіналася скацерка кругавіду, нібы ў адмысловым гіганцкім калейдаскопе адзін дзівосны малюнак змяняўся другім.

Прыгожы і незабыўны беларускі краявід, намаляваны мяккімі фарбамі вечара, пранізаны кволымі блікамі праменняў стомленага сонца. Забыўшыся на ўсё, узрушаны хараством лагоднага вечара, Коля пачынаў спяваць. Гэтаму спяванню не перашкаджаў рытмічны грукат колаў, часамі быў гэты грукат за своеасаблівы, зладжаны акампанімент.

Да чыгуначнага насыпу беглі калгасныя пастушкі. Яны дзівавалiся з дзядзікандуктара, які крычаў на тормазе і нават размахваў рукамі. І пастушкі таксама крычалі — нешта вясёлае, можа кплівае. Іх не чуў бязвусы дзядзя-кандуктар. Ён толькі прывітальна махаў ім рукой. Коля ўспамінаў сваё суровае маленства, калі ён, сын чыгуначнага стрэлачніка, быў за парабчука пасвіў жывёлу і бегаў да насыпу сустракаць паязды. Тады палюбіў песню маленькі пастушок, спяваў звонкім дзіцячым голасам, каб адагнаць ад сябе нудлую самотнасць. Спяваў ён і пасля, юнаком, у цяжкай працы чыгуначнага рамонтнага рабочага. Са спевам, які гоіць боль няўдач і адганяе сум, які сагрэе сэрца радасцю, заўсёды дружыў Коля Лазараў.



Н. Лазараў

Міналі дні і месяцы. Кандуктар жлобінскага рэзерва Лазараў скончыў камандныя курсы і стаў памочнікам начальніка невялічкага раз'езда Некрашы. Памочнік начальніка — усяго адна ступень да начальніка. І таму часамі ўспаміналіся спагадныя словы артыста, але яны ўжо не хвалявалі, здаваліся сумным жартам старога дзівака,—Лазараў стараўся забыцца на іх. Але не мог забыць аб хоры, аб выступленнях перад загадкавай, поўнай людзей залай. Не забывалася асалода дружных воплескаў, што буйнай хваляй узнікалі ў гэтай зале і магутным прыбоем біліся аб ззяючую святлом рампу. Нельга было заглушыць патрэбнасці спяваць не толькі для сябе, радавацца песняй не толькі самому, радаваць ёю другіх. У доўгія вечары дзяжурстваў, калі так сумна гудуць тэлеграфныя правады, гнятучы маладосць і сціскаючы сэрца чорнай тугой, Коля хапаўся за тэлефон і званіў па чарзе на ўсе станцыі Слуцкай лініі.

— Увага! — казаў ён у трубку: — Пачынаем чарговую цыркулярную перадачу. Слухайце канцэрт са студыі раз'езда Некрашы!

Трубку тэлефона Лазараў перадаваў стрэлачніку і той асцярожна трымаў яе перад сваім начальнікам. Лінія слухала першыя ціхія акорды гітары. Потым уступаў чысты, прыгожы тэнар. «Сэрца красуні» — спяваў Коля, укладаючы ў спеў усё тамленне свайго маладога сэрца.

— Дзякуем! — грымела з трубкі: — Біс!

— Просім арыю Ленскага...

— Герцага з «Рыгалета».

— «Прадаўца птахаў»...

І Коля спяваў зноў. Шкадаваў толькі, што не было з кім спяваць дуэтам, трыо. Біс́іравалі па тэлефону доўга і настойліва. Саліст з Некрашаў стамляўся, ён спяваў заключнае жартаўлівае «Саўка ды Грышкаладзілі дуду», потым абвяшчаў:

— Гастроль Лазарава скончана! — і стрэлачнік чапляў трубку.

Спевамі ў калгасе, «цыркулярнымі» канцэртамі па тэлефону адзвінела сталярoўка маладога памочніка ў Некрашах. Ён зноў у Жлобіне: дзяжурыць на далёкай, у чыстае поле кінутай, станцыі Жлобін-Паўночны. З дзяжурства таропка мерыць дарогу па шпалах у клуб, у дэпо — на чарговае выступленне, з чыгуначнымі самадзейнікамі выязджае на лінейныя станцыі. Поспех усюды аднолькавы: спевака Лазарава ўсе ведаюць і любяць.

Але годы няўмольныя, яны бралі сваё. Грэба было думаць аб далейшым прасоўванні на службе...

Тут здарылася нечаканае. З Мінска прыехала брыгада для адбору харыстаў у Тэатр оперы і балета. Лазараў праспяваў брыгадзе каваціну князя з оперы «Русалка». І ад гэтага дня службовая лінія памочніка начальніка станцыі крута змяніла свой кірунак: Лазарава выклікалі ў Мінск. І тут ён зноў успомніў словы старога актора. Яны ўжо не здаваліся сумным жартам.

Упартая вучоба—да таго адменная і так непадобная на жлобінскі хор, удзячнасць чуламу настаўніку вакала Талянкіну, які па-сапраўднаму «раскрыў» голас маладому харысту,—гэтым поўны былі дні Лазарава. Да маладога харыста прыглядаюцца старэйшыя работнікі тэатра—Златагораў і Шнейдэрман, дырэктар тэатра Гантман. Яны бачаць у ім вялікія магчымасці і чула падтрымліваюць таленавітага спевака.

І вось адбылася прэм'ера першай беларускай оперы «Міхась Падгорны». Яна прайшла з вялікім поспехам. Слухач радасна апладзіраваў выканаўцам оперы — сваім улюбёным акторам. Гэтак-жа цёпла і шчыра апладзіраваў ён і выканаўцу ролі Міхася—маладому дэбютанту Нікалаю Аляксандравічу Лазараву. Слухача вабіў яго прыемны лірыка-драматычны тэнар, які так адпавядаў вядучай гераічнай партыі оперы, слухач быў удзячны маладому салісту за выразную дыкцыю, яму быў прыемны абаяльны знешні рысунак мужнага Міхася.

Усхваляваны Нікалай Лазараў выходзіў на апладысменты да ззяючай святлом рампы і ў тумане памяці з'яўлялася зоблік старога артыста жлобінскага драмгуртка...

Спраўдзіліся словы гэтага выпрабаванага жыццём і сцэнай аматара мастацтва.

Макар ПАСЛЯДОВІЧ

Ваеннае майстэрства

★

Апавяданне

★

Зялёная горкаўская паўтаратонка, шпурляючы з-пад колаў клубы цяжкога шэрага пылу, імчалася па шасе. У кабіне сядзелі двое: шустры, неспакойны Мішка Лабанок і пануры, здавалася нават нейкага злосны, Раман Піліпенка.

— Вось табе і вайна! Вось табе і ваякі!—нахіліўшыся да самага вуха Піліпенкі, крычаў у грукаце матора Мішка Лабанок.—За тры дні трыста кіламетраў прайшлі нашы. Усім фронтам прайшлі!

Вецер з шумам біўся аб шырокае, тоўстае шкло кабіны. Дробныя каменьчыкі, падхопленыя імклівым віхрам, часта цокалі па жалезу машыны. Мішка Лабанок прыслухоўваўся да таго, што скажа Раман Піліпенка. Але шофер маўчаў, відаць, вельмі заняты кіраваннем. Мішка нават скоса аглядзеў Піліпенку; яго жылістыя цяжкія рукі, пакладзеныя на руль, звятраны нібы выліты з бронзы твар, суровы стальны шлем на галаве. З-за шырокіх плеч Піліпенкі выглядвала тонкае дула трохлінейкі. Вінтоўка Рамана Піліпенкі стаяла ў кутку. Цераз плячо шофера вісела сумка з гранатамі... Такія-ж грозныя атрыбуты вайны меліся і ў Мішкі Лабанка. Каб не зброя, дык можна-б было падумаць, што па шасе імчыцца не армейская машына, а спяшаецца ў горад за штучным угнаеннем калгасны грузавічок. І сядзяць у ім не чырвонаармейцы, а малодшы конюх і шофер калгаса «Новы шлях».

Часта насустрач машыне траплялiся пешыя, альбо з фурманкамі сяляне. Яны яшчэ здалёку прыветна махалі рукамі. Старэйшыя, згледзеўшы ў машыне шлемы з полымнымі зоркамі, пачціва знімалі шапкі.

Мішка Лабанок расчульваўся ўсё больш і больш. Ён пачаў нават тармасіць панурага Рамана Піліпенку за рукаў:

— Я, браток, гэты дзень семнаццатага верасня трыццаць дзевятага года па ўсё жыццё запамятаю! Нашы там, у калгасе, мусіць, думаюць, што Мішкі, можа, і жывога няма. Мусіць, думаюць, што Мішка на самую перадавую лінію трапіў. А таго не ведаюць, як адны нашы танкі ўвесь панскі гонар растрыбушылі!

— Ты не балбачы,—раптам буркнуў Раман.—Добра глядзі па баках. Хутка за вёскай лес пачнецца. Чуў, што афіцэр'ё толькі і хаваецца ў ім?.. Пазаўчора тут адну машыну абстралялі.

У вачах замільгалі афарбаваныя ў чырвона-белы колер вербы, памазаныя мелам платы і хлявы вёскі. Недарэчнасць гэтага шыкознага бляску смяшыла і разам з тым засмучала.

— Як у цырку,—толькі і прамовіў Піліпенка, кіўнуўшы галавою на гнілы шуляк, які застаўся тырчаць у канцы вёскі ад нейкага разбуранага хлява.—Не дзіва, што насельніцтва сустракала Чырвоную Армію, як самых дарагіх гасцей. Цяпер пакажыся які асэсар у панскім мундзіры—на часткі яго разарвуць.

Мішка Лабанок, падахвочаны ажыўленнем маўклівага Рамана, хацеў ужо расказаць адну цікавую гісторыю, як сяляне адной вёскі разбройлі цэлы эскадрон польскай кавалерыі, але раптам яны апынуліся ў лесе. Шофер моцна сціснуў губы і абмацаў сваю вінтоўку. Потым, кіруючы адной рукою, другою расшпіліў сумку з гранатамі. Мішка, які быў год на пяць маладзей за Піліпенку і таму ва ўсім следаваў за больш вопытным таварышам, таксама падрыхтаваўся.

Дарэмна яны пусціліся адны ў такую небяспечную дарогу! Ім трэба было пачакаць і далучыцца да групы байцоў, якія выязджалі праз гадзіну з гаража. І гнаў-жа чорт гэтага Піліпенку! Цяпер іх могуць пастраляць, нібы курэнят. Разбярыся, што там у глыбіні гэтых калматых нетраў. Можа ўжо страляюць па іх, але пасвісту куль не чуваць толькі з-за таго, што матор раве і вые, як шалёны.

Насеяў чорт абапал дарогі гэтага лесу! Больш за ўсё на свеце любіў цяпер Мішка Лабанок роўнае, без адзінага каменьчыка і пянчука, поле. А гэтае сонца, што, асядаючы за небасхіл, смаліць проста ў вочы! Тут можаш наляцець на цэлы полк бандытаў гарачанькім трапіць у іх лапы!

Мішку здалася, што лесу няма канцакраю, што няма канца-краю звычайнаму напружанню. Нічога няма страшнейшага для чалавека, як засада. Трапіўшы ў засаду, губляецца нават храбрэйшы і дужэйшы з звяроў — леў, які ад нараджэння да самай смерці кожную хвіліну павінен асцерагацца чалавека. У самыя рашучыя хвіліны яго не ратоўвае нават прывычка да небяспекі.

Ні адна армія не рушыць наперад, не высунуўшы далёка перад сабой дапытлівыя шчупальцы—дазорных, разведку.

Гэта ўсё Мішка Лабанок вычытаў з кніг, чуў ад людзей. Але самае непрыемнае, што яшчэ ён ведаў: не вытрымаўшы сакрушальнага ўдару, многія белапалякі рынуліся ў лясы і адтуль, поўныя злобы і нянавісці, пачалі пастрэльваць з вінтовак і кулямётаў па адзіночных чырвонаармейскіх машынах...

— Ну, вось і канец лесу!—з палёгкай уздыхнуў Піліпенка, але зараз-жа спахмурнеў і вылаяўся. Кінуў нагу на тормаз, Мішка ледзь не высадзіў галавою шкло. А калі зірнуў наперад—усё ўнутры яго пахаладзела.

Крокаў за пяцьдзесят ляжала папярок высокага насыпу дарогі агромністая хвоя.

У гэты момант куля ўдарыла ў шкло і, развёўшы вакол круглай дзіркі роўныя лініі расколін, чыркнула аб край мішкавага шлема.

— На зямлю! Пад колы!—зароў Піліпенка, адкідаючы ў бок дзверцы.—Такую іх...

Толькі праз хвіліну, абсыпаны ўвесь зямлёю і трэскамі, якія павырывалі кулі з грузавіка, Мішка апамятаўся. Апамятаўся—і пачаў прыслухоўвацца, прыглядацца.

Стралялі з узгорка на краю лесу. Гулкае рэха разносіла па лесе грымотнае рэха кулямётнай чаргі. Мішка і Раман ляжалі за коламі. Іх, відаць, бандыты заўважылі, бо стрэлы пачасцелі, калі Раман, стараючыся легчы больш зручней, выцяў з-за кола крысо свайго шынелю. Кулі ўмомант зрызманілі моцнае сукно.

Мішка, выкарыстаўшы хвіліну, выцягнуў наперад вінтоўку і выстраліў па ўзгорку. Кулямёт на момант замоўк, каб неўзабаве ўдарыць па тоўстым жалезе і гуме тых колаў, за якім ляжаў Мішка. Раман у сваю чаргу высунуў наперад вінтоўку. Раптам шэрая рагатыўка азвалася на нейкую сотую частку хвіліны над кучкай дзёрну. Мушка вінтоўкі апусцілася крыху ніжэй казырка і Раман націснуў на спуск.

Адразу пасля гэтага захлібнуўся кулямёт. Мішка бачыў, як сударгава мятнуліся ў паветры рукі бандыта. На ўзгорку завылі і залаяліся.

— Адзін спёкся,—кінуў Раман Мішку.—Цяпер астатнія ўжо не выпусцяць нас жывымі.

Па іх зноў пачалі страляць. Спярша з вінтовак, а потым і з кулямёта. Цяжка было ўлавіць паўзу, каб высунуцца і выстраліць. Немагчыма было і ўпаўзці з шасе, з-за гэтых адратоўчых колаў. Мішка з горкатай успомніў свой калгас, чысты ўтульны домік над Прыпяццю. Ніколі ўжо яму не бываць там, не прыгуляць да грудзей светлавалосага Арсенькі... І каб сказаў, што ён, Мішка, загіне на перадавой лініі, у вялікім наступленні! Дык не-ж. У тылу, у далечыні ад фронта, надстрэлілі абознага Мішку Лабанка!.. Падпяргалі на ціхай лясной дарозе. Хутка іх могуць абыйсці з другога боку і тады—канец! Нерухома, абыякавы да ўсяго на свеце, аляжыцца на халодным жвіры шасе калгасны конюх Мішка Лабанок.

Кулямёт замоўк. Замоўклі вінтоўкі. Пустэльна было шасе і ўправа і ўлева. Хоць-бы якая падмога паказалася...

І раптам ясная і шпаркая, нібы маланка, думка мільганула ў галаве Мішкі Лабанка.

— Рома—гукнуў ён ціха да свайго сябра.—А Рома.

— Ну, чаго табе?—азваўся Піліпенка.

— Чаго... Давай я паспрабую адпаўзці ад грузавіка. Там канава... Потым кусты...

— Не раю. Толькі я не кіну сваёй машыны. Гэта-ж тое самае, што байцу страціць даручаную яму вінтоўку.

На ўзгорку ўсё яшчэ была насцярожаная і пагрозная цішыня.

Мішка заспяшаўся.

— А хто думае кідаць? Хіба я прысягі не ведаю? Толькі калі мы будзем так ляжаць, дык яны нас не выпусцяць. А за намі хутка пойдуць машыны з байцамі! Нашы-ж не ведаюць, што тут засада... Чыркануць некалькі разоў па кузавах...

— Хутчэй гавары аб справе!—амаль крыкнуў Раман Піліпенка, які пакутваў не менш за Мішку.

— А вось што я прыдумаў... Давай мы гэтых гадаў ваенным майстэрствам возьмем... А-а?

— Ну?

— Ты ляжы тут і пастрэльвай, а я пастараюся разведаць, колькі іх там. Пастараюся ў тыл зайсці... Пакуль яны першыя не надумаліся гэта зрабіць. Толькі ты палі тут так, нібы нас тут не ўдвух, а цэлы ўзвод. Каб яны не згадаліся, што адзін некуды адлучыўся...

— Кані,—надзвычай прачуленым голасам прамовіў Піліпенка.—Толькі сцеражы сябе. На ражон дарэмна не лезь.

Піліпенка шпарка высунуў з-за кола вінтоўку і грымотнае рэха стрэлаў разлеглося па лесе. Мішка, нібы яшчарка, скруціўся з шасе.

І як толькі Піліпенка, расстраляўшы патроны з магазіна, пачаў закладваць новую абойму, кулямёт застракатаў зноў. Раман перачакаў чаргу і зараз-жа распачаў пальбу па ўзгорку.

Мішка Лабанок, зырка паглядаючы па баках, шпарка поўз наперад. Крокаў за сто ад машыны ён зноў перабраўся цераз шасе і апынуўся на тым баку, дзе былі ворагі. Стараючыся, каб не трэснула віволкая лямінка, трымаючы напагатове вінтоўку, трапяткі Мішка хутка апынуўся каля засады. Яшчэ крокаў дзесяць—і ён убачыў тых, каго не было відаць з дарогі.

Адзін польскі афіцэр сядзеў, прыгнуўшыся, каля ручак кулямёта. Другі папраўляў стужку патронаў. Два другіх бандыты ляжалі непадалёку, страляючы па машыне з вінтовак.

Мішка размахнуўся і кінуў гранату. Страшэнны ўдар скалануў паветра. Потым густая і гарачая цішыня запанавала на ўзгорку.

Толькі адзін з чатырох бандытаў, той, што ляжаў далей ад кулямёта, застаўся жывы. Усхапіўшыся праз які момант з зямлі, ён кінуўся да Мішкі Лабанка, але зараз-жа выпусціў вінтоўку, схапіўся за грудзі.

Куля Рамана Піліпенкі засцела яго на паўдарозе.

Пакуль хлопцы перацягнулі на шасе кулямёт, вінтоўкі і патроны—ужо зусім спямнелася. Раптам яркае святло фар мільганула па вершалінах дрэў і потым шпарка разлілося па шасе. Некалькі машын падляцела бліжэй і спынілася.

— Што тут такое? Што здарылася?—пачулася з пярэдняй машыны.

На дарогу выйшла некалькі камандзіраў. Мішка Лабанок узрадавана зірнуў на іх, і раптам яго правая рука з павагай пацягнулася да стальнога шлема.

У групе камандзіраў ён заўважыў сакратара ЦК і члена Ваенсовета Беларускай ваеннай акругі. Таго, з кім ён сустракаўся і гутарыў у мінулым годзе на з'ездзе калгаснікаў-стаханаўцаў.

— Адбылася маленькая затрымка, таварыш член Ваенсовета, — адрапартаваў Мішка Лабанок.—Гэтыя гады засадаю нас хацелі ўзяць. Але мы іх перахітрылі...

— Як-жа гэта вам удалося? Іх пяць чалавек, кулямёт у іх.. А вас толькі два.

— А мы іх, таварыш Ваенсовет, ваенным майстэрствам узялі: мы іх абкружылі!

ПЕСНЯ ТАНКИСТОВ

(Массовая песня с сопровождением фортепьяно)

Музыка П. ПОДКОВЫРОВА

Текст мл. командира-танкиста Ян. ШИНГАРЕВА



Нам не страшны ни взгорья и ни кручи,
В бою не знаем страха никогда.
Победна поступь армии могучей,
Великой армии республики труда.

С отвагой молодецкою
За родину советскую,
За счастье и прославленный народ
И днем и в ночь беззвездную
Машины наши грозные
Готовы смело ринуться в поход.

Ведь мы не раз отвагу показали,
Когда под Вильно дрались с врагом.
К победам нас ведет любимый Сталин
И наш железный сталинский нарком.

С отвагой молодецкою
За родину советскую,
За счастье и прославленный народ
И днем и в ночь беззвездную
Машины наши грозные
Готовы смело ринуться в поход.

Послушны нам легко и бронь и пушки;
Живем единой тесною семьей.
Но если враг спокойствие нарушит,
Пойдем громить его мы с песней боевой.

С отвагой молодецкою
За родину советскую,
За счастье и прославленный народ
И днем и в ночь беззвездную
Машины наши грозные
Готовы смело ринуться в поход.

Мы мирный труд страны оберегаем,
Нам ярко светит красная звезда;
Когда горнист тревогу заиграет, —
В бою мы будем первые всегда.

С отвагой молодецкою
За родину советскую,
За счастье и прославленный народ
И днем и в ночь беззвездную
Машины наши грозные
Готовы смело ринуться в поход.

„ЦУДОЎНЫЯ ПЕРАЎВАСАБЛЕННІ"

„Сендэр Бланк" у Дзяржаўным Яўрэйскім тэатры БССР

Стары багацей Сендэр Бланк памірае. Як груганы на пах трупа, злятаюцца да яго дзеці і бліжэйшыя сваякі, якія ўжо чуюць шалест асігнацый і звон золата багатай спадчыны. «Заслона ўзнімаецца, — пачынае Шолам-Алейхем свой сатырычны раман «Сендэр Бланк», — і камедыя пачынаецца». Пачынаецца страшная камедыя ліцамернасці людзей, у якіх капіталізм вытруціў лепшыя чалавечыя пачуцці, пакінуўшы ім толькі нізкае імкненне да нажывы, да грошай. Пачынаецца камедыя ў бальзакаўскім разуменні гэтага слова. «Чалавечая камедыя» буржуазных характараў і нораваў. Пачынаецца камедыя, у якой, — гаворыць Шолам-Алейхем, — акторы іграюць цудоўна...

Гэта ў Шолам-Алейхема. А ў спектаклі мы ўбачылі, што слова «камедыя» рэжысёр зразумеў павярхоўна, спрошчана, і ўжо, вядома, з гэтай прычыны акторы, якія ішлі за рэжысёрам, не здолелі, гаворачы словамі Шолам-Алейхема, «цудоўна іграць».

Але, паважаныя чытачы, скажам мы па-шолам-алейхемаўску, заслона паднята. Накіруем-жа нашы погляды на сцэну, сустрэнемся з нашымі старымі знаёмымі з рамана «Сендэр Бланк».

Мы глядзім на сцэну, але дарэмна! Герояў Шолам-Алейхема мы не пазналі. Як падобны яны адзін на другога! Як аголена выражаюць яны сваё жаданне хутчэйшага падзелу спадчыны. А цудоўная ігра актораў па Шолам-Алейхему заключаецца іменна ў тым, што героі па-майстэрску маскіруюць гэта сваё затоенае жаданне і пры агульнасці інтарэсаў з'яўляюцца індывідуальна рознымі. Іх не пераблытаеш. У спектаклі выпустошаны адрозніваючыя якасці большасці герояў і атрымалася амаль поўная адсутнасць характараў і зусім нечаканае для нас пераўвасабленне шолам-алейхемаўскіх герояў.

Сястра Бланка, 70-гадовая Добрыш—дабрадушная старая, якую ніяк не могуць вывесці з цярпення злыя насмешнікі, якая шчыра жадае, каб яе брат ачуняў,—паказана тупой злодзейкай, якая (да чаго дасціпнымі бываюць іншы раз рэжысёрскія выдумкі!) крадзе бутэльку з рэшткамі віна, якое яна не дапіла.

Рэвека, дачка Бланка, паводле рамана — сантыментальная летуценніца, якая да замужжа начыталася чулых раманаў і цяпер марыць сустрэць прыгожага маладога чалавека, падобнага на герояў з прачытаных кніг. Яна па-свойму сумленная. Пасля замужжа, расчараваная ў мужы, яна сустракае сваю мару — цудоўнага маладога чалавека, але шчыра праганяе ад сябе ўсякую мысль аб ім, памятаючы добра, што яна «другому аддадзена». Калі яе муж Восіп цынічна гаворыць ёй аб тым, што ён жадае хутчэйшай смерці яе бацьку, яна, падсвядома жадаючы таго самага, супярэчыць яму. У спектаклі яна поўнасцю атоесамліваецца з Восіпам, больш таго — часам яна нават больш цынічная, чым ён.

А Маркус? У рамане гэта прыгожы юнак 19-ці год, які імкнецца да святла, да ведаў. У спектаклі ён лёгкадумны хлапец, які ў 4-м акце гаворыць фальшывую тыраду аб «растучых у яго крылах».

Страціўшы страшны сэнс камедыі, сыграная сваякамі Бланка, згубіўшы адрозніваючыя якасці герояў рамана пад няўдалай рукою інсцэніроўшчыка, а потым і рэжысёра, таленавітая сатыра Шолам-Алейхема ператварылася ў лёгкаважкі, а часам і безгустоўны вадэвіль. Гэта «цудоўнае пераўвасабленне» сатыры Шолам-Алейхема, як і пераўвасабленне асобных герояў рамана, пацягнула за сабою новыя нечаканыя (але зусім натуральныя ў дадзенай сітуацыі) пераўвасабленні. Таленавітая актрыса Ю. Арончык, амаль заўсёды іграўшая «без паражэнняў», у няправільна вытлумачанай ролі Добрыш стварыла толькі вельмі ўдалую імітацыю голасу недзе чутай ёй старой. Няўдача Арончык красамоўна пацвярджае тое, як многа залежыць ад правільнага кіраўніцтва рэжысёра.

А. Трэпель, апынуўшыся ў новым вадэвілі, вядзе чыста знешнюю ігру, бачаную намі ўжо ў вадэвілі «Гершэле Острапольер». Трэпелю, актору вялікага камедыйнага таленту, варта-б было сур'ёзна падумаць — што ён паказвае? У ролі Менахем-Мендла былі ў Трэпеля месцы, у якіх асэнтляўся трагічны вобраз Менахем-Мендла. У ролі-ж Гершэле, як і ў ролі Восіпа Земеля, апрача некаторых знешніх трукаў прастака, — слова гонару, нічога няма!

Э. Гецберг проста перайшла ў «Сендэр Бланк» з іншых, раней сыграных спектакляў, амаль нічога не страціўшы ў дарозе, захаваўшы тыя-ж манеры, тыя-ж інтанацыі, тую-ж какетлівасць. Наогул-жа акторы ў гэтым спектаклі пушчаны рэжысёрам, як заводныя лялькі, ва ўгоду невядома якой рэжысёрскай мыслі... Выключэннем з'яўляецца толькі П. Вольпіна. Але адзін добра іграючы актор на сцэне, як вядома, не воін.

Вельмі крыўдна за рэжысёра Л. М. Літвінава, які ў мінулым паказаў нам цудоўнай пастаноўкай «Авечай крыніцы», поўнай жыццёвай праўды, драматызма і асвяжаючай бадзёрасці, а зараз не здолеў стварыць мастацка-поўнацэннага спектакла, вартага твора Шолам-Алейхема.

Г. ШВЕДЗІК.

Г. Бярозкін

„Член урада"

Фільм вытворчасці «Ленфільм».

У нас напісана параўнаўча шмат кніг аб так званым «перавыхаванні» чалавека. Возьмеш падобную кнігу ў рукі і ўжо загадзя ведаеш, як у ёй будзе развівацца тэма. Адну трэць кнігі абавязкова зойме паказ цяжкога жыцця героя, яго прыніжанасці і прыдаўленасці дарэвалюцыйным бытам. Затым, у сілу нейкіх удала склаўшыхся ўмоў, герой пачынае «расці» і «перавыхоўвацца». І калі ў пачатку кнігі ён быў працоўным селянінам, дык на апошніх старонках вы абавязкова сустрэнецеся з ім, як з дырэктарам, начальнікам. Усё ў найстражэйшым парадку. Нічога нечаканага. Існуюць самі па сабе дзве разрозненыя стадыі: стадыя «батрак» і стадыя «дырэктар». Чыста механічным супастаўленнем гэтых двух стадый пісьменнік хоча стварыць бачымасць жыццёвага працэсу, хоча ўнушыць чытачу думку аб росце чалавека, аб яго перавыхаванні. І, зразумела, ніякіх разультатаў пісьменнік не дамагаецца толькі таму, што ён не адчувае чалавечай душы, аперыруе худымі абстракцыямі, якія камбінуюцца зусім адвольна, выпадкова і маланатуральна.

І вось мы прагледзелі новы фільм «Член урада».

Тэма, якую апашлілі і здрабнілі многія «мастакі», раптам выявіла велізарную сваю значымасць. І мы, гледачы, былі раптам ашарашаны незвычайнай праўдай гэтага фільма — аднаго з лепшых твораў савецкага кінамастацтва.



«Член урада». Кадр з фільма: «У сакратара райкома ВКП(б)».

Самае каштоўнае ў гэтым фільме — непадробная чалавечая праўда. Перад намі праходзіць цяжкі, поўны ўсемагчымых выпрабаванняў, шлях простай сялянскай жанчыны, «мужам бітай, папамі пужанай, ворагамі стралянай, — жывучай». Аляксандра Сокалава, — так завуць гэту простую жанчыну, — вылучаецца партыяй на адказны пост старшыні калгаса і на гэтай рабоце ў цесным кантакце з народам яна вырастае ў дзяржаўнага чалавека, у члена ўрада. З раптам Сокалаву не вылучалі,—Сокалава сама ўзнялася, сама ўзвысілася максімальным уздымам сваіх інтэлектуальных сіл, прайшоўшы цяжкі шлях, вельмі самабытны ў сваіх падрабязнасцях, але вельмі тыповы для многіх сялянскіх жанчын. Партыя таму звярнула сваю ўвагу на Аляксандру Сокалаву, што ў ёй, тыповай прадстаўніцы народа, знайшло сваё ўнутранае, натуральнае выражэнне ўсё багацце нашых партыйных, комуністычных ідэй. У ёй — простым чалавеку з народа — жыло вялікае пачуццё справядлівасці. І таму цэлы рад справядлівейшых савецкіх законаў быў апярэджан яе ўласнай практыкай, яе дасканалым пачуццём праўды. Так, напрыклад, Сокалава «сэрцам дайшла» да неабходнасці закона аб прагулах.

Калі праглядаеш «Член урада» — фільм, пастаўлены маладымі майстрамі савецкага кіно, рэжысёрамі Зархі і Хейфецам, — дзівішся з незвычайнай цэласнасці дзеючых у ім чалавечых характараў. Змяняючыся і перавыхоўваючыся, Аляксандра Сокалава застаецца сама сабою, Аляксандрай Сокалавай. Ёсць адзін цэльны чалавечы характар, які рэагіруе на навакольнае цэласцю сваіх душэўных рухаў, пярвічным чалавечым пачуццём. Гэта вельмі важна. Часта ў нашых героях вельмі шмат мяркуемых якасцей, — замест якасцей жывых, сапраўдных. Наадварот, усе паводзіны Аляксандры Сокалавай перададзены выдатнай артысткай Марэцкай у вышэйшай ступені праўдзіва і жыццёва.

Стаўшы з простай забітай жанчыны старшынёю калгаса, членам урада, Сокалава зусім не становіцца «новым» чалавекам. Ёй няма патрэбы адмаўляцца ад сваіх прыроджаных якасцей, таму што ўсе гэтыя якасці незвычайна каштоўныя і цанімыя. З глыбіні экрана — з старой вёскі, з горкіх песень Някрасава аб долечнай жаночай — ідзе Марэцкая-Сокалава. Гразь, слота, дым засцілае поўнеба. Сокалава ідзе ў новае жыццё, якое будзе тым добра, што яно шырокае, радаснае, не адхіліць ні песень Аляксандры, ні нават не «бабскіх» слабасцей. А гэтых слабасцей у яе вельмі шмат.

Можна з поўнай упэўненасцю сказаць, што вобраз Аляксандры Сокалавай — першы поўнакроўны жаночы вобраз у савецкім кінамастацтве. Жаночае ў Сокалавай, як адно з асноўных праяў індывідуальнага, чалавечага, перададзена актрысай з выключнай выразнасцю. Вось сцэна сустрэчы Аляксандры з гультаямі. Гультаі едуць у горад. Аляксандра спыняе іх на дарозе, ласкава ўгаворвае пайсці на работу. Гультаі адмаўляюцца. Ім няма ніякай справы да таго, што краіна чакае хлеба, што колас перасцеў, — яны гультаі. І вось, саскочыўшы з каня, Аляксандра хапае лейцы і так, учапіўшыся за лейцы, цягнецца па пыльнай дарозе колькі крокаў за возам бестурботных гулякі.

І следам за гэтай хвалюючай сцэнай ідзе сцэна сустрэчы з Пецем. Ён малады калгаснік, адным з першых ідзе на работу. Аляксандра замест урачыстай прамовы, без слоў, ціха і пяшчотна цалуе Пецю ў лоб. І ў гэтым жэсце, жаноцкім, мяккім, вельмі шмат чалавечай душы.

І ў сцэне калгаснага сходу, калі пасля доўгіх і дарэмных намаганняў зрабіць «навуковы» даклад Аляксандра ў слязах прапануе жулікам і гультаям заняць яе месца, і ў многіх іншых сцэнах Аляксандра Сокалава выступае цэльным характарам, ва ўсёй разнастайнасці жывых чалавечых рысаў.

Шмат што можна сказаць аб фільме «Член урада». Трэба-б было адзначыць беражлівыя адносіны маладых рэжысёраў Зархі і Хейфеца да чалавечага матэрыялу, іх плённае імкненне стварыць поўнакроўныя чалавечыя вобразы, накшталт Палежаева («Дэпутат Балтыкі») і Аляксандры Сокалавай. Трэба-б было гаварыць і аб выдатным уменні маладых рэжысёраў адчуваць амаль няўлоўны нюанс ператварэння звычайнага, здавалася-б, жыццёвага кадра ў кадр абагулены, у кадр, поўнасцю належачы мастацтву. Тут ёсць адчуванне таго «дзязь-дзязь», з якога пачынаецца мастацтва. Адсюль майстэрскае ўменне чаргаваць жанравую сцэну з паэтычным пейзажам, уменне знаходзіць коайнюю характарнасць жэста, твару рэплікі. Нарэшце, можна вельмі падрабязна гаварыць аб акторскім майстэрстве Ваніна, Блінова, Меркур'ева і інш.

Усё гэта заслугоўвае падрабязнага і кваліфікаванага разгляду. Але мы свядома абмежавалі сябе разглядам цэнтральнага вобраза фільма «Член урада»—вобраза Аляксандры Сокалавай. Стварэнне гэтага вобраза, сыгранага Марэцкай, — самая вялікая заслуга фільма, пастаўленага Зархі і Хейфецам па сцэнарыю Вінаградскай.

АД РЭДАКЦЫІ

Пры перакладзе з рускай мовы на беларускую ўспамінаў тав. В. Вольскага аб Э. Самуйлёнку («У Грузіі», № 5 нашай газеты) перакладчыкам, супрацоўнікам рэдакцыі, дапушчаны скажэнні і недакладнасці. «Мутный взор» перакладзена «нягутны погляд», «храм солнца»—«царква сонца», «последние пары»—«памёршыя пары», «старец»—«стары маннах», «Чиатура»—«Чыабуры», «Телави»—«Целаве» і інш.

Рэдакцыя просіць прабачэння ў чытачоў і ў тав. Вольскага за гэтыя свае недагляды.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды».

Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Савецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394 Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду.

Уп. Галоўлітбела № Г—1355.